Нацыянальны інстытут адукацыі

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

ФАКУЛЬТАТЫЎНЫЯ ЗАНЯТКІ

В. І. Русілка

# НЕЗВЫЧАЙНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА: ВЫВУЧЭННЕ ТВОРА Ў ЯГО РОДАВАЙ І ЖАНРАВАЙ СПЕЦЫФІЦЫ

8 КЛАС

Дапаможнік для настаўнікаў

ISBN 978-985-6941-72-9

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**В. І. РУСІЛКА**

# НЕЗВЫЧАЙНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА: ВЫВУЧЭННЕ ТВОРА Ў ЯГО РОДАВАЙ І ЖАНРАВАЙ СПЕЦЫФІЦЫ

**8 клас**

***Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання***

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Літаратура і Мастацтва»
2010

УДК 373.5.016:821.161.3.09
ББК 74.268.3(4Беи)
Р 88

*Серыя заснавана ў 2010 г.*

**Русілка, В. І.**

Р88 Незвычайнае літаратуразнаўства: вывучэнне твора ў яго родавай і жанравай спецыфіцы : 8-ы кл. : дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / В. І. Русілка. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. — 64 с. — (Беларуская літаратура. Факультатыўныя заняткі).

ISBN 978-985-6941-72-9.

**УДК 373.5.016:821.161.3.09**
**ББК 74.268.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-6941-72-9**

© Нацыянальны інстытут адукацыі, 2010
© Афармленне. РВУ «Літаратура і Мастацтва», 2010

# ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ФАКУЛЬТАТЫЎНЫХ ЗАНЯТКАЎ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праблема ўспрыняцця і аналізу твора ў яго родава-жанравай спецыфіцы з'яўляецца складанай і актуальнай для школьнай практыкі літаратурнага навучання, бо ў разуменні жанру, як падкрэсліваў акадэмік М. А. Лазарук, «хаваюцца вельмі важныя сакрэты мастацкай спецыфікі, характару вобразнасці, кампазіцыйнай арганізацыі твора, сістэмы выяўленчых прыёмаў і сродкаў» [8, 58]. Прызнаючы родавыя і жанравыя асаблівасці твора асновай яго аналізу, а не мэтазгоднымі дадатковымі звесткамі, можна пераадолець адрыў формы ад зместу, недаацэнку ролі мастацкіх сродкаў, да якіх настаўнік нярэдка звяртаецца толькі ў дадатак да аналізу зместу твора.

Мастацкія творы адрозніваюцца па спосабе адлюстравання рэчаіснасці (знешні ці ўнутраны па адносінах да аўтара свет), спецыфіцы вобразнасці, мастацкай форме, аб'ёме, моўным афармленні, асаблівасцях эстэтычнага ўспрыняцця (перавага эмацыянальнага ці лагічнага кампанента). У адпаведнасці з гэтым метады і прыёмы вывучэння твораў розных літаратурных родаў павінны мець сваю спецыфіку. Факультатыўныя заняткі будуць дапаўняць праграму асноўнага курса літаратуры, бо менавіта прынцып «пагружэння» ў родавую і жанравую спецыфіку літаратурнага твора ляжыць у аснове канцэпцыі праграмы і падручніка па беларускай літаратуры для 8 класа.

Праграма факультатыва «Незвычайнае літаратуразнаўства: вывучэнне твора ў яго родавай і жанравай спецыфіцы» прадугледжвае выкананне вялікай колькасці творчых заданняў, таму пажадана, каб на ім займаліся падлеткі, якія маюць развітую фантазію, літаратурныя здольнасці, цікавасць да творчасці і, магчыма, самі спрабуюць пісаць творы.

Вучні могуць знаёміцца з літаратурнымі творамі, якія прапануюцца для аналізу, у пазаўрочны час, тым больш што яны ўключаны

ў пералік твораў для чытання і абмеркавання ці для пазакласнага чытання.

**Мэта:** паглыбіць веды вучняў пра родава-жанравую спецыфіку мастацкіх твораў, садзейнічаць развіццю творчых здольнасцей падлеткаў.

**Задачы:**
• прывіваць цікавасць да мастацкай літаратуры;
• узбагачаць веды вучняў пра эпічныя, лірычныя, ліра-эпічныя, драматычныя жанры, іх спецыфіку, сродкі стварэння характару, асаблівасці мовы і кампазіцыі, заканамернасці пабудовы сюжэта, канфлікт, вобразна-выяўленчыя сродкі;
• стымуляваць уласную культуратворчую дзейнасць вучняў;
• развіваць у вучняў здольнасць да аб’ектыўнай крытычнай ацэнкі (у тым ліку і самаацэнкі) вынікаў літаратурнай творчасці.

# НЕЗВЫЧАЙНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА: ВЫВУЧЭННЕ ТВОРА Ў ЯГО РОДАВАЙ І ЖАНРАВАЙ СПЕЦЫФІЦЫ
*(35 гадзін)*

## Уступныя заняткі
*(1 гадзіна)*

Мэта і задачы, змест факультатыўных заняткаў.

## Хто такі пісьменнік?
*(2 гадзіны)*

Творчая індывідуальнасць — асоба аўтара ў працэсе мастацкага перастварэння свету, яе своеасаблівае бачанне жыцця, адлюстраванае ў змесце і форме твора. Талент. Матывы звароту да літаратурнай творчасці. Натхненне. Уплыў асабістай біяграфіі на творчы лёс мастака і эвалюцыя творчай індывідуальнасці. Тыпізацыя суб’ектыўнага вопыту ў творы.

Пісьменнікі: празаікі, паэты, драматургі, сатырыкі і гумарысты. Звесткі з аўтабіяграфій пісьменнікаў («Як я стаў пісьменнікам»). Багацце творчых індывідуальнасцей у беларускай літаратуры (на прыкладзе раней вывучаных твораў). Вершы С. Грахоўскага «Каб пісаліся вершы…», А. Салтука «Натхненне».

## Творчая сустрэча-дыялог
## з пісьменнікам-земляком
## (ці прадстаўленне настаўнікам аднаго
## з сучасных дзіцячых пісьменнікаў)
*(1 гадзіна)*

## Што такое твор?
*(1 гадзіна)*

Мастацкі твор як адзінства формы і зместу. Тэма, ідэя. Аўтарская ўстаноўка. Будова літаратурнага твора. Фабула. Сюжэт. Кампазіцыя. Вусныя паведамленні вучняў «Твор, які мяне асабліва ўразіў» (на прыкладзе раней вывучанага).

## Агульнае ўяўленне пра роды літаратуры
*(4 гадзіны)*

Сінкрэтызм старажытнага мастацтва (слова, музыка, танец). Проза і паэзія. Гісторыя ўзнікнення розных родаў і жанраў літаратуры (ад паведамлення пра падзею да перадачы асабістых перажыванняў). Роды і жанры ў антычнай літаратуры.

Устойлівасць і зменлівасць паняцця «жанр». Агульныя жанравыя прыкметы ў розных відах мастацтва (музыка, жывапіс, тэатр).

Апавяданне А. Федарэнкі «Рэпетыцыя». Спалучэнне ў адным творы элементаў эпічнага і драматычнага роду. Вобраз старшакласніка Антона — пачынаючага пісьменніка. Аналіз напісаных хлопчыкам «п’есак».

<u>Творчая работа.</u> Дапаўненне апавядання А. Федарэнкі: напісанне «сцэнкі са школьнага жыцця» (ці на вольную тэму) для конкурсу школьнай самадзейнасці.

## Лірычныя жанры
*(8 гадзін)*

Лірыка — род літаратуры, які адлюстроўвае рэчаіснасць праз перажыванні аўтара, нясе інфармацыю  пра суб’ектыўны свет асобы. Адсутнасць сюжэта, маналог ад імя лірычнага героя, сціслая афарыстычная форма, пераважна вершаваная мова, насычаная паэтычнымі тропамі, — асноўныя ўласцівасці лірычнага твора, да якога жанру лірыкі  ён ні адносіўся б.

Народная песня — крыніца лірычнай паэзіі. Праслухоўванне запісаў народных песень («Песняры. “Залаты дыск”»: кампакт-дыск, «Троіца»: кампакт-дыск). Параўнанне тэксту песні «Бяроза з лістом…» і верша П. Броўкі «Як ліст дубовы…».

Творчая работа. Напісанне верша (ці лірычнай мініяцюры ў прозе) «Чатырохгранная ваза прыроды» (поры года). Чытанне і абмеркаванне верша А. Наўроцкага «Чатырохгранная ваза».

Чытанне і аналіз вершаў грамадзянскай, філасофскай, пейзажнай, інтымнай лірыкі («Мая Бацькаўшчына» Р. Барадуліна, «Як ліст дубовы...» П. Броўкі, «Прыедзь у край мой ціхі...» Я. Янішчыц, «Над зямлёю шугае верасень...» В. Зуёнка, «Ты мне вясною прыснілася» М. Шушкевіча, «Дзе ты, зорка мая?» А. Русака, «Ты пакліч мяне. Пазаві» Я. Янішчыц і інш. — на выбар настаўніка). Вызначэнне стылявой адметнасці прачытаных твораў: пафас, інтанацыя, сінтакс, будова твораў, спецыфіка вобраза-перажывання. Вуснае славеснае маляванне карцін, якія ўзнікаюць пры чытанні вершаў.

Паняцце пра класічныя жанры лірыкі: філасофска-медытатыўныя (медытацыя, пасланне, філасофскі верш, элегія), велічальныя (ода, гімн, эпітафія, рэквіем), песенныя (раманс, песня), сатырычна-выкрывальныя (эпіграма, пародыя).

Праслухоўванне песень на творы Г. Бураўкіна, М. Шушкевіча і інш., параўнанне іх з вершамі. Азнаямленне з творамі жывапісу, якія суадносяцца па змесце і жанры з прачытанымі вершамі.

Творчая работа. Дапісванне апошняга радка верша М. Танка «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека…». Чытанне верша М. Танка, вызначэнне яго жанравых асаблівасцей.

«Цвёрдыя» страфічныя формы: актава, рандо, рандэль, санет, танка, трыялет, хоку, (жанры японскай паэзіі). Іх гісторыя і роля ў сучаснай літаратуры. Чытанне і жанрава-кампазіцыйны аналіз вершаў У. Шэкспіра «Санет», М. Танка «Санет» і «Антысанет», Д. Бічэль «Трыялет», Н. Гілевіча «Нам разам трыццаць…» (актава). Асаблівасці рыфмоўкі твораў.

Творчая работа. Напісанне трыялета па двух апорных радках, санета ці хоку.

## Эпічныя жанры
*(9 гадзін)*

Эпас — літаратурны род, для якога ўласціва падрабязнае адлюстраванне падзей, людскіх характараў і тых абставін, у якіх яны дзейнічаюць, паказ знешняга, аб’ектыўнага па адносінах да аўтара свету. Аўтарскае апавяданне як выяўленне пазіцыі аўтара ў эпічным творы, у адлюстраванні падзей і характараў. Разгорнуты сюжэт, наяўнасць

вобразаў-персанажаў, пераважна празаічная форма, для якой не ўласціва мова метафар, — тыповыя рысы эпічнага твора. Тры асноўныя цэнтры ўвагі вучняў: падзея, героі твора, аўтар і асаблівасці яго індывідуальнага стылю. Асноўная адзінка аналізу эпічнага твора — эпізод. Разгалінаваная жанравая сістэма эпасу, якая складаецца з твораў малой, сярэдняй і вялікай формы: казка, легенда, паданне, навела, апавяданне, аповесць, раман, цыкл раманаў.

Жанравы аналіз аповесці А. Бадака «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца». Аўтарская ўстаноўка і ідэя твора. Асноўныя эпізоды твора. Вобраз юнага паэта Сяргея Васілевіча, яго супярэчлівы характар. Героі, другарадныя, дадатковыя і выпадковыя персанажы. Сучасны васьмікласнік у творы — ці пазнаяце вы сябе? Складаная кампазіцыя аповесці. Размеркаванне фабульнай прасторы і часу ў творы, прыёмы актывізацыі ўвагі чытача: вяртанне, забяганне наперад, «шахматнае» размеркаванне часу. Партрэт, мастацкая дэталь.

Жанравы аналіз аповесці В. Гапеева «Лёшкава каханне, або Віртуальнае дрэва рэальнасці». Асаблівасці сюжэта і мовы твора.

Жанравы аналіз аповесці-казкі Р. Баравіковай «Лён-Лянок, або Кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка». Аўтарская ўстаноўка і ідэя твора.

Адметнасць жанру фантастычнай аповесці. Фантастычнае і рэальнае ў творы. Сістэма вобразаў у творы. Вобраз астранаўта Савіча, Арцёма і фантастычнай істоты — зялёнага Дрэйка, а таксама яго сыноў. Кульмінацыйны эпізод твора, яго напружанасць.

Аповесць-казка «Лён-Лянок, або Кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка» ў структуры «Казак астранаўта» Р. Баравіковай.

Параўнальны аналіз жанравых асаблівасцей аповесцей А. Бадака «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца» і Р. Баравіковай «Лён-Лянок, або Кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка».

Чытанне і абмеркаванне казак Р. Баравіковай «Венерын чаравічак» і «Касач — кветка чароўных музыкаў» («Казкі астранаўта»). Жанравыя асаблівасці.

Творчае заданне. Напісанне фантастычнай казкі-апавядання пра кветку Астру.

## Ліра-эпічныя жанры
*(2 гадзіны)*

Зліццё эпічнага пачатку (сюжэт, наяўнасць вобразаў-персанажаў, адлюстраванне знешняга ў адносінах да аўтара свету) з лірычным (прысутнасць аўтара, яго асабістая ацэнка падзей, эмацыянальнасць і вобразнасць мовы, вершаваная форма). Асаблівасці ліра-эпічных жанраў: паэмы, балады, байкі, прыпавесці. Чытанне і параўнальны

жанравы аналіз балады А. Лойкі «Юнак быў з-пад Слоніма родам...», байкі У. Корбана «Музыкальная камедыя», прыпавесці А. Вярцінскага «Мы, мёд і пчала».

Творчае заданне. Напісанне байкі або прыпавесці (у вершаванай ці празаічнай форме) на аснове жыццёвых уражанняў.

## Драматычныя жанры
*(7 гадзін)*

Драма (ад грэчаскага слова «дзеянне») — род літаратуры, які адлюстроўвае жыццёвыя з'явы праз паказ непасрэднага дзеяння. Асноўныя драматычныя жанры — трагедыя, трагікамедыя, фарс, вадэвіль, сатырычная і лірычная камедыя, гістарычная, сацыяльная, бытавая драма і г. д. Асаблівасці драмы як роду літаратуры, прызначанага для сцэнічнага ўвасаблення: вострая канфліктнасць дзеяння, дыялагічная форма, выбарачны паказ асобных, самых напружаных эпізодаў дзеяння, дзяленне на акты (дзеі) і сцэны (з'явы), наяўнасць аўтарскіх рэмарак, насычанасць мовы твора падтэкстам.

Сцэнічны час. Сцэнічная прастора. Дзеянне і контрдзеянне. Градацыя рэплік.

Жанравы аналіз камедыі В. Вольскага «Несцерка»: азнаямленне са сцэнічнай гісторыяй п'есы з выкарыстаннем альбомаў, афіш, тэатральных праграм, фотаздымкаў акцёраў у ролі; аналітычнае чытанне па ролях; складанне рэжысёрскага плана спектакля; стварэнне мізансцэн.

Параўнальны аналіз камедыі В. Вольскага «Несцерка» і п'ес Г. Марчука «Новыя прыгоды Несцеркі», У. Бутрамеева «Новыя прыгоды Несцеркі». Пераўвасабленне вучняў у «тэатральную трупу»: сцэнарыста, рэжысёра, акцёраў, мастакоў-дэкаратараў, касцюмераў, майстроў гукавога афармлення і г. д. Падрыхтоўка да інсцэніроўкі адной з камедый.

Творчае заданне. Наведванне тэатра, прагляд адной з п'ес і напісанне водгуку на спектакль (ці інсцэніроўка твора на школьнай сцэне).

## Прагназуемыя вынікі

Васьмікласнікі сістэматызуюць і паглыбяць літаратурныя ***веды*** і будуць усведамляць:

• прынцыповае адрозненне родаў літаратуры (эпічнага, лірычнага, ліра-эпічнага, драматычнага), іх асноўных жанраў у фальклоры і літаратуры, мастацкія асаблівасці, сродкі адлюстравання жыцця і спосабы паказу чалавека ў творах гэтых жанраў;

• багацце і асаблівасці моўна-выяўленчых сродкаў мастацкай выразнасці ў розных літаратурных творах;

• спецыфіку літаратурнай творчасці, багацце творчых індывідуальнасцей у беларускай літаратуры;

• тыпалагічныя жанравыя сыходжанні ў розных відах мастацтва .

Вучні ўдасканаляць свае чытацкія ***уменні:***

• аналізаваць літаратурны твор з улікам яго родава-жанравай спецыфікі;

• асэнсоўваць уласныя ўражанні, эмоцыі, пачуцці і апісваць іх;

• узнаўляць мастацкія карціны і вобразы;

• устанаўліваць прычынна-выніковую сувязь паміж падзеямі і ўчынкамі герояў, характарызаваць і параўноўваць герояў аднаго ці некалькіх твораў;

• актыўна карыстацца вобразна-выяўленчымі сродкамі мовы, аб’ектыўна ацэньваць уласнае выкананне;

• інсцэніраваць п’есу, прадумваючы рэплікі, рэмаркі, дэкарацыі, касцюмы, музычнае суправаджэнне і інш.;

• ацэньваць літаратурны твор і творы іншых відаў мастацтва, усведамляючы іх спецыфіку і разумеючы творчую манеру аўтараў.

Вучні будуць мець магчымасць **развіваць эстэтычны густ, уласныя літаратурныя здольнасці** і крытычна ацэньваць іх.

## ЛІТАРАТУРА

1. Белакоз, А. Вучу дзетак складаць вершы / А. Белакоз // Бел. мова і літаратура ў школе. — 1991. — № 9. — С. 39—42.

2. Бершадская, Н. Р., Халимова, В. З. Литературное творчество учащихся в щколе: Кн. для учителя: Из опыта работы / Н. Р Бершадская, В. З. Халимова. — М. : Просвещение, 1986.

3. Верціхоўская, М. У. Кніга Р. Баравіковай «Казкі астранаўта» / М. У. Верціхоўская // Бел. мова і літаратура ў школе. — 2007. — № 1,2.

4. Восприятие и изучение произведений в их родовой и жанровой специфике // Методика преподавания литературы / под ред. О. Ю. Богдановой, В. Г. Маранцмана. — В 2-х ч. — М. : Просвещение: ВЛАДОС, 1994. — Ч. 2. — 288 с.

5. Гардзіцкі, А. Гутаркі, інтэрв'ю, дыялогі пра літаратуру / А. Гардзіцкі. — Мінск, 1988.

6. Грыцаль, Т. М. Тэарэтыка-метадычныя асновы фарміравання паняцця пра жанр пры вывучэнні беларускай прозы ў старэйшых класах / Т. М. Грыцаль // Бел. мова і літаратура ў школе. — 2002. — № 1. — С. 37—46.

7. Лазарук, М. А., Ленсу А. Я. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. А. Лазарук, А. Я Ленсу. — Мінск, 1983.

8. Лазарук, М. А. Навучанне і выхаванне творчасцю: Пед. роздумы і пошукі / М. А. Лазарук. — Мінск : Нар. асвета, 1994. — 200 с.

9. Майсейчык, А. А. Фарміраванне паняццяў аб родах і жанрах мастацкіх твораў / А. А. Майсейчык // Народная асвета. — 1986. — № 4. — С. 47—51.

10. Молдавская, Н. Д. Литературное развитие школьников в процессе обучения / Н. Д. Молдавская. — М., 1976.

11. Мяжэвіч, В. А. Класічныя (цвёрдыя) формы лірыкі ў сучаснай беларускай паэзіі / В. А Мяжэвіч // Бел. мова і літаратура ў школе. — 2008. — № 5. — С. 58—63.

12. Наровчатов, С. Необычное литературоведение / С. Наровчатов. — Изд. 3-е. — М. : Дет. лит., 1981. — 366 с.

13. Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса: Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. — Мінск : Маст. літ., 2003. — 153 с.

14. Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П.Рагойша. — 3-е выд., дапрац. і дапоўн. — Мінск : Беларус. навука, 2004. — 576 с.

15. Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. — Мінск, 2001.

16. Рагойша, В. П. Уводзіны ў літаратуразнаўства: Вершаванне : курс лекцый / В. П. Рагойша. — Мінск, 2004.

17. Русілка, В. І. Сучасная беларуская паэзія: Творчыя індывідуальнасці / В. І. Русілка. — Віцебск, 2005. — 101 с.

18. Рыбникова, М. А. Очерки по методике литературного чтения / М. А. Рыбнікова. — М. : Просвещение, 1985. — 288 с.

19. Тычко, Г. К. Асновы літаратурна-мастацкай творчасці / Г. К. Тычко. — Мінск : БДУ, 2005. — 175 с.

20. Цітова, Л. К. Аналіз эпічнай творчасці ў сярэдніх класах / Л. К. Цітова // Урок літаратуры ў школе: Кніга для настаўніка / пад рэд. М. А. Лазарука, В. У. Івашына. — Мінск : Нар. асвета, 1995. — С.74—79.

21. Цітова, Л. К. Лірыка на ўроку (асаблівасці ўспрымання пейзажнай лірыкі школьнікамі сярэдніх класаў) / Л. К. Цітова // Урок літаратуры ў школе: Кніга для настаўніка / пад. рэд. М. А. Лазарука, В. У. Івашына. — Мінск : Нар. асвета, 1995. — С. 37—73.

22. Чернец, Л. В. Литературные жанры (проблемы типологии и поэтики) / Л. В. Чернец. — М., 1982.

23. Энциклопедический словарь для юношества. Литературоведение от «А» до «Я». — М., 2001.

24. Энциклопедический словарь юного филолога / редкол. : Г. В. Степанов [и др.]. — М., 1987.

# ДАПАМОЖНІК ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

## УВОДЗІНЫ

Факультатыў «Незвычайнае літаратуразнаўства: вывучэнне твора ў яго родавай і жанравай спецыфіцы» павышае эстэтычны ўзровень літаратурнага навучання, уводзіць яго ў агульнамастацкі кантэкст і дае магчымасць выявіць і ўдасканаліць уласныя творчыя здольнасці вучняў.

Факультатыўныя заняткі будуць дапаўняць праграму асноўнага курса літаратуры, бо менавіта прынцып пагружэння ў родавую і жанравую спецыфіку літаратурнага твора ляжыць у аснове канцэпцыі праграмы і падручніка па беларускай літаратуры для 8 класа.

Праблема ўспрыняцця і аналізу мастацкага твора ў яго родава-жанравай спецыфіцы традыцыйна выклікае даследчыцкую зацікаўленасць з боку вядучых вучоных-метадыстаў. Так, у свой час яшчэ М. А. Рыбнікава, распрацоўваючы метады і прыёмы вывучэння літаратурных твораў у школе, справядліва падкрэслівала: «Метадычныя прыёмы дыктуюцца прыродай твора». Найбольш істотны ўклад у тэарэтычнае абгрунтаванне праблемы ўнеслі Н. Д. Малдаўская, У. Г. Маранцман, А. Ю. Багданава, З. Я. Рэз, М. А. Корст, беларускія вучоныя-метадысты М. А. Лазарук, М. І. Мішчанчук, В. У. Івашын, В. Я. Ляшук і інш. Разам з тым для школьнай практыкі вывучэння літаратуры тыповым недахопам з’яўляецца ігнараванне родавай і жанравай спецыфікі літаратурнага твора, прымяненне метадаў і прыёмаў аналізу, якія не адпавядаюць прыродзе дадзенага мастацкага тэксту. У метадычных дапаможніках для настаўніка нярэдка прапануецца вывучаць п’есу як звычайны эпічны твор, складаць план лірычнага верша, чытаць яго па строфах і радках (ці нават «па ланцужку») або пераказваць змест, знаёміць з фальклорнымі творамі без уліку іх асаблівасцей як жанраў

вуснай творчасці народа. У час працы над канцэпцыяй рэфармавання літаратурнай адукацыі акадэмік М. А. Лазарук справядліва падкрэсліваў недапушчальнасць такога становішча: «…жанраваму аспекту ў школьным курсе літаратуры не толькі не ўдзяляецца належная ўвага, на жанравыя асаблівасці твора ўвогуле часта глядзяць як на нейкі дадатковы, малазначны штрых да яго характарыстыкі. Дзесьці ў канцы размовы пра твор паведамляецца, што гэта аповесць, паэма, балада, лірычны верш і г. д. Між тым якраз у разуменні жанру хаваюцца вельмі важныя сакрэты мастацкай спецыфікі, характару вобразнасці, кампазіцыйнай арганізацыі твора, сістэмы выяўленчых прыёмаў і сродкаў». Сапраўды, толькі прызнаючы родавыя і жанравыя асаблівасці твора зыходнай кропкай аналізу, а не мэтазгоднымі дадатковымі звесткамі, можна пераадолець адрыў формы ад зместу, недаацэнку ролі «мастацкіх сродкаў», да якіх настаўнік нярэдка звяртаецца ў дадатак да аналізу змястоўнага боку твора.

Адной з асноўных прычын адзначаных недахопаў у школьным літаратурным аналізе з'яўляецца недакладнае разуменне эстэтычнай спецыфікі твораў розных родаў і жанраў і, адпаведна, недастатковая дыферэнцыяцыя метадаў і прыёмаў вывучэння тэксту. Пры гэтым варта падкрэсліць, што аб'ектыўны працэс дыфузіі літаратурных родаў і жанраў не здымае, а толькі ўзмацняе вастрыню праблемы, абцяжарваючы як для настаўніка, так і для вучня вызначэнне ўнутраных законаў, па якіх напісаны твор і якім павінен быць падпарадкаваны яго аналіз. Ды і сам метадычны тэрмін «аналіз літаратурнага твора» з'яўляецца ўмоўным: праца над тэкстам мае хутчэй аналітыка-сінтэтычны характар, бо выдзяленне кампанентаў мастацка-выяўленчай структуры мэтазгодна праводзіць толькі пры пастаянным суаднясенні іх з ідэйнай задумай аўтара і захаванні эстэтычнай цэласнасці твора, яго мікра- і макравобразнай будовы.

Мастацкія творы адрозніваюцца па спосабе адлюстравання рэчаіснасці (знешні ці ўнутраны па адносінах да аўтара свет), спецыфіцы вобразнасці, мастацкай форме, аб'ёме, моўным афармленні, асаблівасцях эстэтычнага ўспрыняцця (перавага эмацыянальнага ці лагічнага кампанента). У адпаведнасці з гэтым метады і прыёмы вывучэння твораў розных літаратурных родаў павінны мець сваю спецыфіку. Заўважым, што менавіта прынцып «пагружэння» ў родавую і жанравую спецыфіку літаратурнага твора ляжыць у аснове канцэпцыі падручніка для 8 класа, аўтарамі якога з'яўляюцца М. А. Лазарук, В. І. Русілка і І. М. Слесарава.

Вызначаючы родавую прыналежнасць таго ці іншага твора, неабходна памятаць пра гістарычна зменныя крытэрыі гэтага суаднясення. Раздзяленне літаратуры на лірыку, эпас і драму ў асноўным вызначалася ступенню прысутнасці аўтара ў творы (Арыстоцель), характарам творчага працэсу пісьменніка (Лесінг), часам, у які адбываюцца па-

дзеі твора (Гётэ і Шылер), адносінамі мастака да рэчаіснасці (Гегель), асаблівасцямі паэтычнага зместу кожнага роду (Бялінскі). Сённяшняе разуменне родавай спецыфікі зменнае і ўлічвае ўсе вышэйназваныя падыходы, аднак за аснову мэтазгодна браць, на нашу думку, болей дакладны і істотны гегелеўскі пункт гледжання.

Для эпічнага твора ўласціва падрабязнае адлюстраванне падзей, людскіх характараў і тых абставін, у якіх яны дзейнічаюць. Эпічны твор паказвае знешні, аб'ектыўны па адносінах да аўтара свет. Пазіцыя аўтара ў эпічным творы знаходзіць дакладнае і часта прамое выяўленне ў аўтарскім апавяданні, у адлюстраванні падзей і характараў. Разгорнуты сюжэт, наяўнасць вобразаў-персанажаў, пераважна празаічная форма, для якой не ўласціва мова метафар, — тыповыя рысы эпічнага твора. У адпаведнасці з гэтым вылучаюцца тры асноўныя цэнтры ўвагі вучняў: падзея, героі твора, аўтар і асаблівасці яго індывідуальнага стылю. Асноўная адзінка аналізу эпічнага твора — эпізод. Эпічныя творы маюць дастаткова разгалінаваную жанравую сістэму, якая складаецца з твораў малой, сярэдняй і вялікай формы: казка, легенда, паданне, навела, аповесць, раман, цыкл раманаў. Пры разнастайнасці жанравых форм агульныя родавыя рысы ў іх пераважаюць, вызначаючы методыку вывучэння твораў.

У ходзе працы над эпічнымі творамі выкарыстоўваюцца наступныя метады і прыёмы: выразнае і каменціраванае чытанне эпізоду; вызначэнне прычынна-выніковай сувязі падзей; складанне плана твора і яго асобных закончаных сэнсавых частак; выбарачнае чытанне тэксту (партрэт, пейзаж і г. д.); рознага віду пераказы (падрабязны, сціслы, выбарачны, творчы); састаўленне характарыстык персанажаў; матывацыя ўчынкаў і высвятленне псіхалагічнага стану, думак і перажыванняў герояў. У якасці прыёмаў, якія стымулююць уласную літаратурную творчасць вучняў, можна прапанаваць складанне і расказванне казкі, «дапісванне» сюжэта, разважанне пра далейшы лёс літаратурных герояў.

Лірычныя творы паказваюць рэчаіснасць праз перажыванні аўтара. Лірыка нясе інфармацыю перш за ўсё пра суб'ектыўны свет асобы. Гэта адзіны род літаратуры, які паказвае самакаштоўнасць звычайных чалавечых пачуццяў, таму ён мае выключнае значэнне для фарміравання эмацыянальнай культуры вучняў. Адсутнасць сюжэта, маналог ад імя лірычнага героя, сціслая афарыстычная форма, пераважна вершаваная мова, насычаная паэтычнымі тропамі, — асноўныя ўласцівасці лірычнага твора, да якога б жанру лірыкі ён ні адносіўся. Пры аналізе верша важна не парушыць яго эмацыянальнай насычанасці, цэласнасці яго вобразных элементаў (адзінага вобраза-перажывання і мікравобразаў: метафар, эпітэтаў, параўнанняў, рытміка-інтанацыйных прыёмаў, сінтаксічных фігур і г. д.). Арганічнымі метадамі і прыёмамі, якія дазваляюць гэтага дасягнуць, з'яўляюцца наступныя: выразнае чытан-

не; вуснае слоўнае маляванне; выяўленне фактаў біяграфіі паэта, якія леглі ў аснову твора; знаёмства з гісторыяй яго напісання; параўнанне верша і блізкіх да яго твораў музычнага і выяўленчага мастацтва (у тым ліку песень, напісаных на дадзены тэкст, і ілюстрацый да яго); супастаўленне вершаў розных аўтараў на адну і тую ж тэму або вершаў, напісаных адным аўтарам у розны час; параўнанне арыгінала твора і яго перакладаў на вядомыя вучням мовы; разгорнутае маналагічнае выказванне вучняў паводле афарыстычных радкоў верша. Эфектыўнымі, пры ўмове творчага і педагагічна ўважлівага выкарыстання, могуць быць прыёмы, якія стымулююць уласную вершатворчасць вучняў: дапісванне апошняга радка альбо страфы верша, напісанне вершаў па зададзенай схеме чаргавання радкоў (трыялет, актава, санет), напісанне вершаў па зададзеных рыфмах ці на прапанаваную тэму. Пры гэтым важна, каб вучні разглядалі такія заданні перш за ўсё як спробу наблізіцца да таямніцы паэзіі, законаў яе стварэння.

Ліра-эпічныя жанры (паэма, балада, байка, прытча) характарызуюцца зліццём эпічнага пачатку (сюжэт, наяўнасць вобразаў-персанажаў, адлюстраванне знешняга свету) з лірычным (прысутнасць аўтара, яго асабістая ацэнка падзей, эмацыянальнасць і вобразнасць мовы, вершаваная форма). Пры аналізе такіх твораў неабходна спалучаць метады і прыёмы работы над эпічнымі і лірычнымі тэкстамі, паказваючы, як зліццё розных родавых асаблівасцей узбагачае твор, абумоўлівае яго мастацкую непаўторнасць.

Драма (ад грэчаскага слова «дзеянне») — род літаратуры, які адлюстроўвае жыццёвыя з’явы праз паказ непасрэднага дзеяння. Асноўныя драматычныя жанры — трагікамедыя, фарс, вадэвіль, сатырычная і лірычная камедыя, гістарычная, сацыяльная, бытавая драма і г. д. Аднак любая п’еса пішацца перш за ўсё для сцэнічнага ўвасаблення, і з гэтага вынікаюць яе родавыя асаблівасці: вострая канфліктнасць дзеяння, дыялагічная форма, выбарачны паказ асобных, самых напружаных эпізодаў дзеяння, дзяленне на акты (дзеі) і сцэны, наяўнасць аўтарскіх рэмарак, насычанасць мовы твора падтэкстам. Ускладняе вучнёўскае ўспрыняцце драмы (вершаванай ці празаічнай) знешняя адсутнасць аўтарскай пазіцыі, таму асаблівую ўвагу пры чытанні п’есы трэба надаваць аўтарскім заўвагам (рэмаркам). Асноўная метадычная ўмова паўнавартаснага вывучэння драматычнага твора — стварэнне ва ўяўленні школьнікаў сцэнічнага эфекту. Для гэтага мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя метады і прыёмы: азнаямленне са сцэнічнай гісторыяй п’есы з выкарыстаннем альбомаў, афіш, тэатральных праграм, фотаздымкаў акцёраў у ролі; аналітычнае чытанне па ролях; складанне рэжысёрскага плана спектакля; стварэнне мізансцэн; распрацоўка эскізаў касцюмаў, грыму і дэкарацый да спектакля і інсцэніроўка асобных эпізодаў п’есы; наведванне тэатра, прагляд спектакля ці тэлеспектакля з наступным напісаннем водгуку ці рэцэнзіі.

Такім чынам, вывучэнне літаратурнага тэксту ў яго родавай і жанравай спецыфіцы і сродкамі, якія ёй адпавядаюць, дапамагае спасцігнуць эстэтычную прыроду твора, яго сэнс, змест і форму, зразумець розныя спосабы выяўлення аўтарскай пазіцыі, актывізуе цікавасць да вывучэння літаратуры, яе выхаваўчае і развіваючае ўздзеянне, стымулюе пазнавальную і творчую актыўнасць вучняў.

**Мэта** факультатыва: паглыбіць веды вучняў пра родава-жанравую спецыфіку мастацкіх твораў, развіваць творчыя здольнасці падлеткаў.

**Задачы:**

– прывіваць цікавасць да мастацкай літаратуры;

– узбагачаць веды вучняў пра эпічныя, лірычныя, ліра-эпічныя, драматычныя жанры, іх спецыфіку, сродкі стварэння характару, асаблівасці мовы і кампазіцыі, заканамернасці пабудовы сюжэту, канфлікт, вобразна-выяўленчыя сродкі;

– стымуляваць уласную культуратворчую дзейнасць вучняў;

– прывіваць вучням здольнасць да аб’ектыўнай крытычнай ацэнкі (у тым ліку і самаацэнкі) вынікаў літаратурнай творчасці.

## ПРЫКЛАДНАЕ ПЛАНАВАННЕ ФАКУЛЬТАТЫВА «НЕЗВЫЧАЙНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА: ВЫВУЧЭННЕ ТВОРА Ў ЯГО РОДАВАЙ І ЖАНРАВАЙ СПЕЦЫФІЦЫ»

| № тэмы | Тэма | Колькасць гадзін | Міжпрадметныя сувязі | Творчая работа |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Уступныя заняткі. Мэта і задачы, змест факультатыўных заняткаў | 1 | | |
| 2 | Хто такі пісьменнік? | 2 | | |
| 3 | Творчая сустрэча-дыялог з пісьменнікам-земляком (ці прадстаўленне настаўнікам аднаго з сучасных дзіцячых пісьменнікаў) | 1 | | |
| 4 | Што такое твор? | 1 | Музычны твор, твор выяўленчага мастацтва, спектакль, кінафільм, твор дэкаратыўнага мастацтва, архітэктуры, танец і г. д. | Вусныя паведамленні вучняў «Твор, які мяне асабліва ўразіў» |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 5 | Агульнае ўяўленне пра роды літаратуры. Апавяданне А. Федарэнкі «Рэпетыцыя» | 4 | Агульныя родавыя прыкметы ў розных відах мастацтва (музыка, жывапіс, тэатр) | Дапаўненне апавядання А. Федарэнкі: напісанне «сцэнкі са школьнага жыцця» (ці на вольную тэму) для конкурсу школьнай самадзейнасці |
| 6 | Лірычныя жанры. Агульнае ўяўленне пра лірыку. Народная песня і верш | 2 | Фальклорныя песні. («Песняры. "Залаты дыск"»: кампакт-дыск, «Троіца»: кампакт-дыск і інш.) | Напісанне верша ці лірычнай мініяцюры ў прозе «Чатырохгранная ваза прыроды» (поры года) |
| 7 | Чытанне і аналіз вершаў грамадзянскай, філасофскай, пейзажнай, інтымнай лірыкі. Класічныя жанры лірыкі: філасофска-медытатыўныя, велічальныя, песенныя, сатырычна-выкрывальныя | 4 | Песні: І. Лучанок «Мой родны кут», «Я не га́ню землі чужыя...», Ю. Семяняка «Ты мне вясною прыснілася...». Музыка: П. І. Чайкоўскі «Сентыментальны вальс», «Поры года», Вівальдзі «Поры года», Ф. Шапэн «Накцюрн», Ю. Багатыроў «Накцюрн». Жывапіс: Г. Вашчанка «Мір зямлі маёй», Л. Шчамялёў «Асенні кліч», П. Данелія «Беларуская мелодыя», «Асенняя звонкасць», М. Бялыніцкі-Біруля «Прыцемкі юнага мая». | Вуснае славеснае маляванне карцін, якія ўзнікаюць пры чытанні верша. Дапісванне апошняга радка верша М. Танка «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...» |
| 8 | «Цвёрдыя» страфічныя формы (актава, санет, трыялет, і інш.) | 2 | У. Шэкспір «Санет». («Мастак цудоўны, незраўнаны час...») | Напісанне трыялета па двух апорных радках, санета ці хоку |
| 9 | Эпічныя жанры. Агульнае ўяўленне. Жанравы аналіз аповесцей А. Бадака «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца», В. Гапеева «Лёшкава каханне, або Віртуальнае дрэва рэальнасці» | 4 | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 10 | Жанравы аналіз аповесці-казкі Р. Баравіковай «Лён-Лянок, або Кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка». Фантастычныя казкі Р. Баравіковай «Венерын чаравічак», «Касач — кветка чароўных музыкаў» («Казкі астранаўта») | 3<br><br>2 | Народныя казкі. Навуковая фантастыка | Напісанне фантастычнай казкі-апавядання пра кветку Астру |
| 11 | Ліра-эпічныя жанры. Балада А. Лойкі «Юнак быў з-пад Слоніма родам...». Байка У. Корбана «Музыкальная камедыя». | 1<br><br>1 | | Напісанне байкі або прыпавесці (у вершаванай ці празаічнай форме) на аснове жыццёвых уражанняў |
| 12 | Драматычныя жанры. Агульнае ўяўленне пра драму. Жанравы аналіз камедыі В. Вольскага «Несцерка». Параўнальны аналіз камедыі «Несцерка» і п'ес Г. Марчука «Новыя прыгоды Несцеркі», У. Бутрамеева «Новыя прыгоды Несцеркі» | 7 | Батлейка — народны лялечны тэатр, яго гісторыя і мастацкая спецыфіка. Агульнае ўяўленне пра тэатральнае мастацтва. Наведванне (ці прагляд відэазапісу спектакля) | Напісанне водгуку на наведаны спектакль. Інсцэніроўка п'есы |

## Хто такі пісьменнік?

**Навучальная мэта** — пазнаёміць вучняў з сутнасцю пісьменніцкай творчасці, паняццямі «талент», «натхненне», даць уяўленне пра матывы звароту да літаратурнай творчасці.

**Выхаваўчая мэта** — прывіваць павагу да пісьменніцкай літаратурнай дзейнасці, пачуццё адказнасці перад мастацкім словам.

Пісьменнік — аўтар літаратурных твораў, які прафесійна займаецца мастацкай творчасцю. Тыя, каго называюць пісьменнікамі, спрадвеку выклікаюць павагу, захапленне, бо іх задача — несці людзям праз мастацкае слова дабро, праўду і прыгажосць. Нават нейтральнае і будзённае паняцце «аўтар» нясе ў сабе глыбокі сэнс — лацінскае «auctor» паходзіць ад дзеяслова augere — павялічваць, прымнажаць, так калісьці называлі перамаганосных военачальнікаў, якія мацавалі магутнасць дзяржавы. Пісьменнік таксама прымнажае духоўныя багацці свайго народа і чалавецтва ў цэлым. Польскі вучоны Ян Парандоўскі добра вызначаў сутнасць паняцця «пісьменнік»: «Нельга гэтым словам называць кожнага, хто толькі бярэцца за мастацтва пісьма. Рысы,

уласцівыя для пісьменніка як мастака слова, трэба шукаць у яго фантазіі, натхненні, у глыбока чалавечым разуменні свету, у клопаце пра выбар мастацкіх сродкаў, якімі найбольш поўна можна выклікаць задуманае ім уражанне — эстэтычны эфект, эмацыянальны, — і, нарэшце, а можа быць, перш за ўсё трэба шукаць у яго ўласным стылі».

Неабходная і адметная ўласцівасць пісьменніка – наяўнасць спецыфічных прыродных літаратурных здольнасцей, якія, дзякуючы творчай вучобе ў класікаў літаратуры і няспыннай працы над сабой і ўласнымі творамі, перарастаюць у талент.

Літаратурныя здольнасці звычайна праяўляюцца ў чалавека ў раннім узросце, і тым больш важна мець уяўленне пра талент і матывы звароту да пісьменніцкай дзейнасці. У гэтым можа дапамагчы ўсходняя прыпавесць.

### Талент пісьменніка

Да Майстра прыйшоў пісьменнік і папрасіў навучыць яго мудрасці.

— Адны пішуць для таго, каб зарабіць сабе на жыццё; другія — каб падзяліцца сваімі поглядамі ці ўзняць пытанні, якія хвалююць чытачоў; трэція — каб разабрацца ў саміх сабе, — сказаў яму Майстар. — Папулярнасць такіх пісьменнікаў недаўгавечная. Сапраўднае слова прыходзіць да таго, хто піша, таму што не мае сіл стрымліваць жаданне пісаць.

Паразважаўшы трохі, ён дадаў:

— Такія пісьменнікі выражаюць Боскае незалежна ад таго, пра што пішуць.

Сапраўды, у прыродзе таленту шмат невытлумачальнага, патаемнага, многія вядомыя аўтары гавораць пра тое, што творы нібы «надыктоўваюцца» ім вышэйшай сілай. І гэта толькі павышае адказнасць пісьменніка, які павінен жыць і пісаць у адпаведнасці з самымі высокімі маральнымі патрабаваннямі, несці людзям ідэалы дабра, справядлівасці, прыгажосці, гуманізму і любві да сваёй Айчыны.

На пытанне «Хто такі пісьменнік?» вучням лягчэй адказаць пералікам: Францыск Скарына, Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў… Дзеці могуць лёгка доўжыць гэты спіс, але наўрад ці суадносяць гэтыя імёны з рэальнымі людзьмі. Між тым пісьменнікі жылі і жывуць побач з намі, а будучыя — недзе зараз сядзяць за школьнай партай. Каб стаць пісьменнікам, чалавек ад прыроды павінен быць надзелены літаратурнымі здольнасцямі: багатай творчай фантазіяй, адчуваннем рытму і гармоніі, уменнем заўважаць трапныя і арыгінальныя дэталі, чуйнасцю да прыгажосці. Калі малады чалавек вучыцца на лепшых узорах сусветнай літаратуры і ўдасканальвае свае ўменні, то творчыя здольнасці могуць перарастаць у талент, без якога немагчыма прафесійная літаратурная дзейнасць. Талент, па вызначэнні літаратуразнаўцы В. П. Рагойшы, гэта

вастрыня і арыгінальнасць светаўспрымання, глыбіня разумення жыцця, выдатнае валоданне моўнымі скарбамі, арсеналамі паэтыкі, што ўвасабляецца ў высокім творчым майстэрстве. А вось як вызначае сутнасць таленту народны пісьменнік Беларусі Іван Мележ:

«Можна спрачацца пра тое, што такое талент і што яго вызначае, але думаецца, адна з галоўных якасцей таленту пісьменніка — гэта здольнасць яго адчуваць, хваляваццa жыццём навокал, жыццём асобных людзей, краіны, свету.

Чым вастрэйшая гэтая здольнасць успрымаць, адгукацца, тым больш убірае яго сэрца, яго розум, тым яны багацейшыя. Тым багацейшы талент» [4, с. 175].

Існуюць і іншыя вызначэнні таленту, аднак даследчыкі пагаджаюцца, што з'яву гэтую цяжка вытлумачыць, бо яна закранае высокія сферы духоўнага.

Часта прыходзіцца чуць выраз «паэты і пісьменнікі». Ён недакладны, бо пісьменнік — гэта ўвогуле прафесійны аўтар літаратурных твораў. А ўжо ў залежнасці ад таго, у якім родзе, відзе ці жанры літаратуры працуе пісьменнік, яго можна назваць паэтам, празаікам, драматургам, сатырыкам, гумарыстам, публіцыстам, крытыкам і г. д.

Гаворачы пра аўтара паэтычных твораў, мы звычайна атаясамліваем паняцці рэальнай асобы, творчай індывідуальнасці і нават лірычнага героя. Між тым гэта паняцці розныя. Вядома, вялікую ролю адыгрывае асабісты жыццёвы вопыт чалавека, яго рысы характару, схільнасці і перакананні, прафесія, асяроддзе і іншае. Таму і ёсць сэнс знаёміцца з жыццём і творчым шляхам аўтара, шукаючы крыніцы творчасці і яе імпульсы. Аднак творчая індывідуальнасць — гэта асоба аўтара ў працэсе мастацкага пераўтварэння свету. А з'ява гэтая часта бывае невытлумачальнай (многія паэты гавораць, што творчы працэс непрадказальны, яго нельга запланаваць, што натхненне прыходзіць нечакана і паэзія, «госця нябесная», нібы дыктуецца нейкай вышэйшай сілай). Польскі даследчык Ян Парандоўскі ў кнізе «Алхімія слова» прыводзіць шматлікія прыклады такой непрадказальнасці і гаворыць нават аб тым, што творчасць дае магчымасць пражыць іншае жыццё, надаўшы свайму герою, у тым ліку і лірычнаму, рысы, якіх у рэальнасці якраз не хапае аўтару. Творчая фантазія аддаляе паэтычную індывідуальнасць аўтара ад яго як рэальнага чалавека, робіць свабодным ад побытавых рэалій. Да таго ж чытач з'яўляецца «сааўтарам» мастацкага твора, ад чытацкага ўспрымання залежыць наша меркаванне пра пісьменніка. Трэба мець багатае ўяўленне, каб зразумець і разам з аўтарам стварыць яго мастацкі свет, мець літаратуразнаўчую падрыхтоўку і эстэтычны густ, каб ацаніць паэтычныя вобразы і атрымаць асалоду ад іх прыгажосці, трэба быць душэўна чуйным, каб перажыць разам з пісьменнікам хваляванне і адкрыць мудрасць думкі.

Многія людзі ў дзяцінстве адчуваюць жаданне складаць вершы, а вось потым губляюць цікавасць да паэзіі і нават не хочуць яе чытаць. Нібы саромеюцца сваіх нядаўніх паэтычных спроб. Але калі чалавеку трэба перадаць сваё ўзрушэнне, сказаць прыгожа, ён і ў сталым узросце ўсё роўна звяртаецца да паэтычнага слова, хоць паштоўку з вершаваным тэкстам шукае. Чалавеку патрэбна паэзія. Аднак успрымаць і чытаць яе і праўда цяжэй, чым прозу. Акрамя ўжо названых чытацкіх уменняў і здольнасці да суперажывання, для таго каб зразумець унутраны сэнс слова, якое і само па сабе стварае вобраз, а ў вершы набывае асаблівае значэнне, каб пачуць і ацаніць багацце гукапісу, асэнсаваць унутранае сугучча слоў, трэба яшчэ і добра ведаць і адчуваць родную мову. Адным словам, успрыманне паэзіі, як і яе напісанне, з'ява творчая і складаная, і чытач таксама своеасаблівая творчая індывідуальнасць. Аднак і ўзнагарода за працу чытача вялікая: паэзія паглыбляе эмацыянальны свет асобы, выхоўвае «культуру пачуцця» (К. Ушынскі), вучыць разумець пачуцці іншых людзей і дае надзею на ўзаемаразуменне.

Абсалютная большасць прафесійных літаратараў, прычым не толькі паэтаў, але і празаікаў, пачыналі пісаць ў дзяцінстве менавіта вершы . Не дзіўна, бо ў гэты час звяртаюцца да паэтаў многія. Ёсць нават своеасаблівы «кантрольны ўзрост», які звычайна супадае з першымі выступленнямі ў друку: 12—14 гадоў. «Паэзія адкрываецца ў тым перыядзе жыцця, калі пачуцці яшчэ свежыя, зачараванне светам наймацнейшае, калі ўсё ўяўляецца новым і незвычайным» (Я. Парандоўскі). Аднак не кожны ў маладосці піша вершы, не кожны з тых, хто піша, становіцца паэтам. Патрэбны асаблівы талент, прыроджаны дар паэтычнага ўспрыняцця свету.

Для пачатку літаратурнага шляху вельмі важныя крыніцы літаратурнага натхнення: ураджанні маленства і юнацтва, прыгажосць родных мясцін, першае каханне і г. д. Жыццёвы лёс аўтара, безумоўна, накладвае адбітак на яго творчасць, аднак рэальны вопыт па-рознаму ўвасабляецца ў залежнасці ад тыпу мастацкага мыслення (рэалістычнага ці рамантычнага, аб'ектыўна-выяўленчага ці суб'ектыўна-выразнага). Суб'ектыўны вопыт у літаратуры толькі штуршок для напісання твора, тыпізацыі фактаў у агульназначныя мастацкія вобразы.

Як справядліва зазначае літаратуразнаўца М. Храпчанка, «...роля творчай індывідуальнасці вызначаецца не проста своеасаблівасцю, ...а той своеасаблівасцю, якая выражаецца ў стварэнні агульназначных мастацкіх каштоўнасцей. ...Сваё набывае важнае значэнне не ў сілу толькі непадобнасці з іншымі праявамі індывідуальнага ў літаратуры, а тады, калі яно ўзбагачае свет чалавека, мастацкую культуру народа».

Такім чынам, паняцці «творчая індывідуальнасць пісьменніка» і «рэальная асоба аўтара» ўзаемазвязаныя, але не тоесныя. А І. В. Гё-

тэ і ўвогуле палемічна сцвярджаў, што ў сапраўднага творцы прыроджанае веданне свету і яму залішні асабісты вопыт. Аднак нельга адмаўляць ролю асяроддзя, прафесіі, жыццёвых абставін, назіральнасці, вучобы, азнаямлення з гісторыяй, культурай, — усяго таго, што называецца біяграфіяй і ў вельмі апасродкаванай форме фарміруе творчую індывідуальнасць. Паняцці «рэальная асоба», «творчая індывідуальнасць» перасякаюцца, як дзве акружнасці, што маюць агульную частку, памер якой своеасаблівы ў кожным канкрэтным выпадку.




Нас цікавіць якраз перасячэнне, у якім і нараджаецца сапраўдная літаратура. І ў гэтым сэнсе без біяграфіі, без асабіста перажытага няма творчасці.

Літаратурныя здольнасці звычайна праяўляюцца рана. Пра пачатак творчасці і прычыны звароту да яе аўтары гавараць ахвотна, успамінаючы адчуванне радасці і задавальнення, святла і палёту, якое дае гэты занятак.

Якуб Колас успамінаў, што цяга да паэтычнай творчасці, якой спрыялі байкі Крылова, паэзія Пушкіна і творчасць Гогаля, абудзілася ў раннім дзяцінстве, а калі будучаму народнаму пісьменніку было дванаццаць гадоў, ён напісаў першы верш «Вясной», прачытаў яго бацьку і атрымаў у падарунак адзін рубель гасцінца.

Аркадзь Куляшоў пачаў цікавіцца вершамі і спрабаваць пісаць іх з сямі гадоў, а ў дванаццаць былі надрукаваны яго першыя творы. Магчыма, вучні ўжо ведаюць, што славуты верш «Бывай», вядомы ў выкананні гурта «Песняры» як песня «Алеся», А. Куляшоў напісаў, калі яму было чатырнаццаць гадоў — столькі, колькі зараз васьмікласнікам! Праўда, потым на працягу ўсяго жыцця аўтар звяртаўся да перапрацоўкі твора, удасканальваючы яго.

Максім Танк пачаў пісаць яшчэ ў пачатковай школе, пераказаўшы вершам легенду пра Шкленікоўскае возера, а калі вучыўся ў Радашковіцкай беларускай гімназіі, то амаль усе яго сябры займаліся вершаскладаннем.

Уладзімір Караткевіч пачаў складаць вершы у шэсць год, потым пісаў апавяданні і абавязкова ілюстраваў іх малюнкамі. Дарэчы, ён, як і многія літаратары, меў living рознабаковыя таленты: спяваў, іграў на музычных інструментах, валодаў акцёрскім майстэрствам, у сталым узросце выконваў ролі ў кінафільмах па сваіх жа творах.

Паэтэса Данута Бічэль успамінае, што ў паэзію прыйшла ад песні, першы друкаваны верш «прапела на сенажаці, грабучы сена», а калі хадзіла з сяброўкамі ў шостым класе ў школу праз лес, «рыфмавалі калектыўна свае прыгоды».

Вядома, у такім юным узросце пачынаючыя аўтары не асэнсоўвалі прычыны звароту да творчасці, ім проста хацелася паспрабаваць свае магчымасці. Сталыя ж аўтары матывуюць сваю літаратурную працу неабходнасцю самавыяўлення, жаданнем змяніць свет да лепшага, зрабіць яго больш добрым і прыгожым, а часам творчасць нават памагае чалавеку перажыць жыццёвыя няўдачы. Толькі адзінкі з тых, хто спрабуе свае сілы ў прыгожым пісьменстве, становяцца прафесійнымі літаратарамі. Аднак спроба творчасці дапамагае лепш зразумець і самога сябе, і тыя законы, па якіх «майструецца» твор. Да таго ж гэта проста цікава! Таму настаўніку, як сведчыць вопыт вядомых педагогаў-практыкаў (В. М. Туркевіча, І. П. Волкава і многіх іншых), ёсць сэнс падтрымліваць першыя літаратурныя спробы вучняў, тактоўна ацэньваючы і папраўляючы іх.

Адзін з асноўных матываў звароту да літаратурнай творчасці — прага самавыяўлення асобы. Значыць, асоба павінна быць багатай, цікавай для чытача, значнай для грамадства. Жыццёвы шлях класікаў беларускай літаратуры — Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Куляшова, М. Танка, П. Панчанкі — дае выдатныя ўзоры служэння сваёй Радзіме, народу, культуры. Падзеі іх асабістага жыцця, тыпізуючыся ў творы, станавіліся выяўленнем народнага лёсу і народнага характару беларусаў.

Высокую прыроду літаратурнай і ўвогуле мастацкай творчасці пацвярджае і тое, што яна немагчыма без натхнення. Гэтае слова і ў беларускай, і ў рускай, і ў іншых мовах свету нясе ў сабе корань «дух» (параўнайце рускае «вдохновение», «воодушевление», польскае «natchnienie», англійскае «inspiration», нямецкае «inspiration» і г. д.).

Натхненне — гэта стан, калі з магутнай сілай выяўляюцца творчыя магчымасці асобы, калі яе розум, воля, уяўленне, фантазія працуюць у адным накірунку для дасягнення пастаўленай мэты, стымулюючы адно аднаго.

Момант натхнення — гэта выключны пад'ём творчых магчымасцей чалавека, гэта станоўча афарбаваныя эмоцыі (уздым, захапленне, энтузіязм). Па словах філосафа і эстэтыка Г. Гегеля, мастацкае натхненне «заключаецца менавіта ў тым, што паэт поўнасцю захоплены сваім прадметам, цалкам уваходзіць у яго і не супакойваецца да той пары, пакуль не надасць мастацкай форме завершаны характар».

Надзвычай паэтычна вызначае сутнасць натхнення рускі пісьменнік Г. К. Паустоўскі: «Натхненне ўваходзіць у нас як іскрыстая летняя раніца ў кроплях расы і зараслях вільготнай лістоты, якая толькі што скінула туманы летняй ночы. Яна асцярожна дыхае нам у твар сваёй гаючай прахалодай».

Гэты ж аўтар падкрэслівае і ўніверсальны характар натхнення, якое вядома не толькі пісьменніку, але і кожнаму творчаму чалавеку: «Кожны чалавек хоць бы і некалькі разоў за сваё жыццё, але перажыў стан натхнення — душэўнага пад'ёму, свежасці, жывога ўспрымання рэчаіснасці, паўнаты думкі і ўсведамлення сваёй творчай сілы».

Натхненне не бывае плённым без настойлівай працы. Гэта падкрэсліваюць славутыя музыканты І. Стравінскі і П. Чайкоўскі, да твораў якога мы будзем неаднаразова звяртацца:

«Натхненне — рухаючая сіла, якая прысутнічае ў любой чалавечай дзейнасці. Але гэтая сіла прыводзіцца ў дзеянне намаганнем, а намаганне — гэта і ёсць праца».

*(кампазітар І. Стравінскі)*

«Натхненне не прыходзіць да лянівых».

*(кампазітар П. Чайкоўскі)*

Літаратура мае разгалінаваную сістэму родаў, відаў і жанраў. Пісьменнік працуе ў адным ці некалькіх з іх, у залежнасці ад гэтага вызначаюць празаікаў, паэтаў, драматургаў, сатырыкаў, публіцыстаў, перакладчыкаў, сцэнарыстаў. Тых, хто піша творы жартоўнага характару, называюць гумарыстамі, калі ж іх смех мае выкрывальны характар — сатырыкамі.

Творчая індывідуальнасць пісьменніка знаходзіцца ў пастаяннай эвалюцыі, таму ён з часам можа звяртацца да розных родаў і відаў літаратуры. На думку Яна Парандоўскага, імкненне выявіць сябе ў паэзіі ці прозе залежыць ад узросту аўтара: «Маладосць суб'ектыўна лірычная, іншая справа проза: яна патрабуе сталасці, ведання жыцця». Многія аўтары, якія пачыналі як паэты, потым пішуць прозу (нават такі славуты празаік, як В. Быкаў, па яго прызнанні, пачынаў з вершаў, нядаўна ў літаратуразнаўстве сталі вядомыя ваенныя вершы І. Шамякіна, якога доўгі час лічылі «чыстым» празаікам).

Беларуская літаратура багатая на яркія пісьменніцкія індывідуальнасці, знаёмства з якімі дапаможа нам глыбей спасцігнуць законы мастацкай творчасці.

## Літаратура


1. Гегель, Г. Эстетика : в 4-х т. / Г. Ф. Гегель. — М. : Искусство. — 1971.

2. Парандовский, Я. Алхимия слова / Я. Парандовский. — М. : Правда, 1990. — 656 с.

3. Паустовский, К. Золотая роза / К. Паустовский. — М. : Педагогика, 1991.

4. Тычко, Г. К. Асновы літаратурна-мастацкай творчасці / Г. К Тычко. — Мінск : БДУ, 2005. — 175 с.

5. Храпченко, М. Б. Творческая индивидуальность писателя и развитие литературы / М. Б. Храпченко. — М. 1972. — 61—62с.

## Творчая сустрэча-дыялог з пісьменнікам-земляком (ці прадстаўленне настаўнікам аднаго з сучасных дзіцячых пісьменнікаў)

**Навучальная мэта** — пазнаёміць вучняў з творчай асобай пісьменніка, паглыбіць уяўленне пра літаратурныя традыцыі свайго краю.

**Выхаваўчая мэта** — выхоўваць павагу да літаратурнай творчасці, гонар за таленавітых людзей сваёй радзімы.

Заняткі мэтазгодна правесці ў форме літаратурнай гасцёўні. Настаўнік загадзя пазнаёміць вучняў з жыццёвым і творчым шляхам госця. Вучні падрыхтуюць выразнае чытанне (у тым ліку чытанне на памяць) твораў аўтара ці ўрыўкаў з іх, зробяць ілюстрацыі па тэме. Настаўнік павінен паклапаціцца, каб вучні сфармулявалі пытанні госцю (добра, каб і ён загадзя меў уяўленне пра тое, што ад яго хочуць пачуць вучні).

Калі няма магчымасці запрасіць пісьменніка на заняткі, настаўнік можа ў цікавай форме прадставіць пісьменніка-земляка, выкарыстаўшы краязнаўчы матэрыял, аўтабіяграфію, успаміны, дзённікі, прачытаць урыўкі з яго твораў, правесці літаратурную гульню «Ці ведаеш ты пісьменнікаў-землякоў?». Такія заняткі могуць адбыцца ў школьным літаратурным музеі.

## Што такое твор?

Сутнасцю любога віда мастацтва з'яўляецца адлюстраванне рэчаіснасці і яе стварэнне праз мастацкі вобраз. Твор мастацтва ўвогуле — гэта матэрыяльнае ўвасабленне мастацкага вобраза ў своеасаблівай форме (гукавой, пластычнай, колеравай, славеснай і інш.). Як сказана ў «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі», мастацкі твор выступае як «асобая, мастацка-вобразная сістэма знакаў, спецыфічная мастацкая "мова" (музычная, архітэктурная, харэаграфічная, кінематаграфічная і інш.), што нясе чалавеку змешчаную ў ёй мастацкую інфармацыю». Мастацкі твор адначасова з'яўляецца адлюстраваннем жыцця, яго падабенствам і выдуманай аўтарам новай рэальнасцю, створанай з дапамогай фантазіі мадэллю жыцця. Таму мастацкі твор выклікае складанае і супярэчлівае ўражанне: глыбокае перажыванне, падобнае на перажыванне рэальных падзей, і эстэтычнае задавальненне, якое ўсведамляецца менавіта як уражанне ад твора, народжанага фантазіяй майстра.

Па вызначэнні В. П. Рагойшы, літаратурны твор — завершаны па форме празаічны ці вершаваны тэкст, які адпавядае існуючым у пэў-

ным часе і асяроддзі законам мастацкасці. Кожны твор мае сваю творчую гісторыю — шлях ад задумы (першапачатковых уяўленняў пра сутнасць твора) да яе ўвасаблення праз тэму, ідэю, фабулу твора, яго вобразна-мастацкую сістэму, сюжэт і кампазіцыю.

Літаратурны твор, як і любы твор мастацтва, успрымаецца намі ў двух планах: як канкрэтна-рэалістычны малюнак жыцця (таму мы суперажываем аўтару ці героям, захапляемся імі ці асуджаем іх) і як створаная аўтарам мастацкая мадэль жыцця (таму мы ацэньваем эстэтычную форму твора, яго стылявыя асаблівасці, вобразна-выяўленчыя знаходкі пісьменніка).

## Літаратура

1. Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса: Даведнік маладога літаратара : для ст. шк. узросту / В. П. Рагойша. — Мінск. : Маст. літ., 2003. — 158 с.

2. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5-ці т. / рэдкал. : І. П. Шамякін [і інш.]. — Мінск. : БелСЭ,1986. Т. 3. — 751 с.

# Агульнае ўяўленне пра роды літаратуры

**Навучальная мэта** — замацаваць і паглыбіць паняцці «род» і «жанр» літаратуры, пазнаёміць з апавяданнем А. Федарэнкі «Рэпетыцыя», у якім суіснуюць тэксты розных літаратурных родаў.

**Выхаваўчая мэта** — стымуляваць уласныя літаратурныя здольнасці.

Пачынаючы гаворку пра літаратурныя роды і жанры, якія сфарміраваліся яшчэ ў старажытнай Грэцыі, нам прыйдзецца заглянуць у далёкую гісторыю чалавецтва. Вучоныя называюць першабытным сінкрэтычным мастацтвам такое, у якім яшчэ былі зліты ў адзінае цэлае танец, музыка і слова. Менавіта так нашы далёкія продкі паведамлялі адно аднаму пра ўдалае паляванне ці перамогу над ворагам. Сяргей Нараўчатаў у кнізе «Незвычайнае літаратуразнаўства» выводзіць такую формулу ўзнікнення старажытнай фальклорнай песні: праца — рытм — слова. Самы старажытны род літаратуры — эпас, які паведамляе пра падзею — таксама з самага пачатку быў рытмізаваны. Гамераўскія «Іліяда» і «Адысея» — эпічныя творы — мелі вершаваную форму. Калі чалавецтва зразумела значнасць асабістых пачуццяў кожнага, узнікла лірыка — вершаваныя творы, якія ў Старажытнай Грэцыі выконваліся пад акампанімент музычнага інструмента — ліры. Відавочна сінкрэтычны мастацкі характар і сёння мае дра-

ма — творы, прызначаныя для пастаноўкі на сцэне, уключаюць у сябе і непасрэдны паказ дзеяння, і танец, і музыку, і спевы.

Такім чынам, розныя віды мастацтва маюць агульныя карані. Яшчэ цяжэй правесці мяжу паміж рознымі родамі, відамі і жанрамі літаратуры (тым больш, што французскае слова genre абазначае «род, від», а грэчаскае слова paesis — творчасць увогуле). Тым не менш мяжа гэтая ёсць, і менавіта яна вызначае мастацкую спецыфіку твора.

Проза (ад лацінскага *prosa* — прамая) — адзін з двух асноўных відаў (побач з паэзіяй) літаратурна-мастацкай творчасці, невершаваная літаратура, якая не мае закончанай сістэмы рытмічных паўтораў і развітых вобразна-выяўленчых сродкаў.

Паэзія — адзін з асноўных відаў мастацтва слова, эмацыянальна-вобразная вершаваная творчасць, якой уласціва павышаная эмацыянальнасць і музычны пачатак.

Непасрэднай залежнасці ад прозы ці паэзіі падзел твораў на роды (эпас, лірыка, драма) не мае, аднак усё ж эпічныя творы часцей пішуцца прозай, лірычныя адносяцца да паэзіі, драма ж можа выкарыстоўваць як празаічную (у сённяшняй літаратуры часцей), так і паэтычную (звычайна ў старажытнасці і ў XVIII—XIX стст.) форму.

Падзел літаратуры на роды і жанры склаўся ў антычнай літаратуры.

Эпас (грэчаскае *epos* — слова, апавяданне, песня) — род літаратуры, асноўнай рысай якога з'яўляецца разгорнуты паказ падзей, чалавечых характараў і тых абставін, у якіх яны дзейнічаюць.

Лірыка (грэчаскае *lirikos* — творы, якія выконваліся пад акампанемент ліры) — род мастацкай літаратуры, які адлюстроўвае жыццё праз перажыванні і пачуцці аўтара.

Драма (грэчаскае *drama* — дзеянне) — род літаратуры, які паказвае жыццё ў непасрэдным славесна-фізічным дзеянні ці, па словах антычнага пісьменніка Арыстоцеля, праз «перайманне дзеяння... праз дзеянне, а не праз аповед».

У сучаснай літаратуры роды і жанры рэдка існуюць у чыстым выглядзе. Найбольш прывычны для літаратуразнаўцаў прыклад — ліра-эпічныя творы, у якіх спалучаюцца рысы эпасу і лірыкі (паэмы, балады, прытчы, байкі). Разам з тым В. П. Рагойша не без падстаў адносіць байку да ліра-драматычных відаў літаратуры, хоць яна і не прызначана для сцэнічнага ўвасаблення.

У апавяданні А. Федарэнкі «Рэпетыцыя» таксама суіснуюць мастацкія тэксты, якія можна аднесці да розных літаратурных родаў: эпасу і драмы. Сам твор мае ўласцівы для апавядання выразны і нескладаны сюжэт са школьнага жыцця: завуч дае шасцікласнікам заданне падрыхтавацца да раённага конкурсу мастацкай самадзейнасці. Старшакласнік Антон — таленавіты пачынаючы пісьменнік — піша для дзяцей некалькі сцэнак. Вучні паказваюць іх завучу, аднак ні адна з іх яму не падабаецца. У выніку застаецца не самы лепшы варыянт, і невядома,

ці даб'юцца дзеці ўдачы на конкурсе. А вось папярэднія «сцэнкі» сапраўды заслугоўвалі ўвагі. Першая з і, пра пана і мужыка, мае казачна-прытчавы характар і ў алегарычна-філасофскай форме ўслаўляе дабро і справядлівасць: мужык не змог не падзякаваць пану, які яго смачна пакарміў, хоць хваліць нельга было, і атрымаў за гэта вялікую ўзнагароду, нягледзячы на ўмовы таго конкурсу, які праводзіў пан. Другая сцэнка ў дасціпнай форме і з цікавымі паваротамі сюжэта расказвае пра школьную інтрыгу і тое, чаго і з якой прычыны выпускнікі школы дабіліся праз некалькі гадоў. Трэці ўрывак прысвечаны дастаткова глыбокаму псіхалагічнаму асэнсаванню падзей часоў паўстання К. Каліноўскага. Завуч, неблагі ўвогуле педагог, які, аднак, вечна спяшаецца, не ацаніў твораў Антона. Хлопец жа сур'ёзна ставіцца да пісьменніцкай творчасці і нават друкуецца ў часопісе «Першацвет». Урэшце Антон піша прымітыўную стылізацыю пад фальклор «Пра Янку, злога Цмока і Ганку», якраз тое, ад чаго засцерагаў завуч дзяцей напачатку працы. Непаслядоўнаму і загружанаму справамі Андрэю Адамавічу няма калі ўдумацца, і ён выдае ацэнкі «Цудоўна!», «Выдатна!», а дзеці добра адчуваюць, што ранейшыя сцэнкі былі значна лепшымі.

Аналізуючы драматычныя ўрыўкі з твора А. Федарэнкі, варта звярнуць увагу вучняў на тое, чым яны адрозніваюцца ад асноўнага тэксту апавядання (дыялагічная форма, наяўнасць рэмарак, больш дынамічнае развіццё падзей, канфліктнасць).

У эпічнай частцы твора дзеянне разварочваецца пастунова і няспешна, фабульныя час і прастора хоць і неразгалінаваныя, але змяняюцца: клас — актавая зала, некалькі дзён, на працягу якіх ідуць рэпетыцыі школьнага гуртка. Персанажаў даволі многа, з іх можна вылучыць герояў: Антона і завуча Андрэя Адамавіча; другарадных: практыкантку Лізу Сасноўскую, Кацю, Аксану; эпізадычных: вучні. Персанажам даюцца разгорнутыя партрэтныя характарыстыкі: «светлавалосы хударлявы Антон, рэдактар школьнай сценгазеты, паэт, футбаліст і вялікі выдумшчык; Віця — невысокі, таўсматы, добры (заўсёды дасць спісаць); і Мікола — круглы выдатнік і разам з тым чамусьці надзвычай сарамлівы». Герой, Антон, характарызуецца яшчэ і праз мову іншых персанажаў як здольны пачынаючы пісьменнік.

У сцэнках жа, якія, па сутнасці, — з'явы драматычнага твора, захоўваецца невялікая нязменная колькасць дзейных асоб і адзінства месца.

Дома вучні паспрабуюць самі напісаць з'яву п'есы, якая дапоўніла б апавяданне А. Федарэнкі, бо з тым варыянтам, на якім спыніліся героі, яны, вядома, не выйграюць конкурс школьнай самадзейнасці. Ускосным матывам для такой творчай работы можа быць і сама назва апавядання А. Федарэнкі: рэпетыцыя — гэта ўсё ж спроба, нешта незакончанае. Магчымую тэматыку і змест сцэнак варта папярэдне абмеркаваць з вучнямі.

# ЛІРЫКА І ЛІРЫЧНЫЯ ЖАНРЫ

**Навучальная мэта** — паглыбіць веды вучняў пра лірыку як літаратурны род, лірычныя жанры і ўласцівыя ім вобразна-выяўленчыя сродкі, «цвёрдыя формы» верша, іх гісторыю і ролю ў сучаснай літаратуры.

**Выхаваўчая мэта** — выхоўваць культуру пачуццяў, маральныя і эстэтычныя ідэалы, стымуляваць уласную культуратворчую дзейнасць вучняў.

Вывучэнне лірычнай паэзіі справядліва лічыцца адной з самых складаных метадычных праблем. Вучняў цяжка зацікавіць творам, у якім няма сюжэта, не расказваецца пра нейкую цікавую падзею. Дзеці сярэдняга школьнага ўзросту яшчэ не маюць звычкі прыслухоўвацца да свайго эмацыянальнага стану, разумець пачуцці іншых людзей. Таму з самага пачатку гутаркі пра паэзію трэба давесці да вучняў думку, што лірыка вучыць людзей узаемаразуменню, душэўнай чуласці, дапамагае адчуць чужыя радасць і смутак, трывогу і боль як свае, і калі юны чытач хоча, каб людзі разумелі яго, адгукаліся на яго самыя патаемныя пачуцці і перажыванні, ён павінен найперш навучыцца разумець і паважаць пачуцці іншых. Лірыка якраз і дае такую шчаслівую магчымасць суперажывання. Пачуй іншага, калі хочаш, каб у самы неабходны момант нехта адгукнуўся на тваё перажыванне — гэтую думку вельмі важна падкрэсліць, прыступаючы да вывучэння лірычнай паэзіі.

Лірыка — род літаратуры, які адлюстроўвае жыццё праз вобраз-перажыванне. Яна ўзнікла пазней, чым эпас, тады, калі чалавек зразумеў важнасць самага інтымнага, самага патаемнага пачуцця. Гэта адзіны род літаратуры, у аснове якога ляжыць самакаштоўнасць чалавечага перажывання. Звяртаючыся непасрэдна да магутнай, у многім падсвядомай і неспазнанай сферы духоўнага жыцця чалавека — сферы эмацыянальнай, лірычныя творы гармануюць унутраны свет асобы, выхоўваюць культуру пачуццяў.

У спрадвечных спрэчках паміж рацыянальным і эмацыянальным, паміж мэтазгоднасцю і душэўным парывам лірычная паэзія заўсёды сцвярджае прыярытэт дабра і высакародства, агульначалавечых каштоўнасцей, высокіх ідэалаў прыгажосці. Звяртаючыся да даволі абмежаванага кола «вечных» тэм, якія звязаны з самымі галоўнымі пытаннямі чалавечага быцця, лірыка далучае нас да «высокага неба ідэалу» (Анатоль Вярцінскі), да ўсеагульнага духоўнага жыцця, а значыць, робіць чалавека лепшым, асобу — больш глыбокай і дасканалай.

Ставячы перад сабой мэту выхавання свабоднай і духоўна багатай асобы, здольнай да самавыражэння і самарэалізацыі, пастараемся найпаўней выкарыстаць тыя багатыя магчымасці, якія дае лірыка для выяўлення і развіцця індывідуальнасці.

Развіваць вучня як асобу, узбагаціць яго душу, разбудзіць яго творчыя магчымасці, навучыць разумець іншага — да гэтага перш за ўсё трэба імкнуцца пры чытанні верша на занятках. Такога выніку немагчыма дасягнуць, разглядаючы твор як ілюстрацыю да ідэалагічных лозунгаў, наіўна-рэалістычную пейзажную замалёўку ці агульнафіласофскія тэзісы і абмяжоўваючы мастацкі аналіз пытаннямі «Пра што твор...» і «Што хацеў аўтар ім сказаць?». Галоўнае пытанне, адказ на якое павінны шукаць вучні, — «Чаму?». Чаму менавіта так, а не інакш, сказаў паэт, які ўнутраны падтэкст хаваецца за кожным словам, вага якога непараўнальна ўзрастае ў невялікім вершы, як праз вобразы выяўляецца паэтычная індывідуальнасць, у чым сакрэт нашай далучанасці да лірычнага перажывання? Адказы на гэтыя пытанні, якія вызначаюць аналіз паэтычнага твора, знайсці няпроста, але сам працэс творчага пошуку і будзе шляхам да глыбокага разумення, спасціжэння лірычнага верша.

Хацелася б засцерагчы настаўніка ад механічнага вычлянення, простага называння «мастацкіх сродкаў» (метафар, эпітэтаў, параўнанняў і г. д.) у працэсе аналізу верша, ад неасэнсаванага завучвання тэрмінаў (замест гэтага няхай вучні часцей самастойна звяртаюцца да «Слоўніка літаратуразнаўчых тэрмінаў»). Механічны падыход разбурае цэласнасць успрымання, эмацыянальнае ўздзеянне твора. Гутарка пра любы мікравобраз твора магчыма толькі пры адначасовым суаднясенні прыкладу з агульным вобразам-перажываннем, з аўтарскай ідэяй (*як* дапамагае данесці яе той ці іншы вобраз, чаму менавіта *гэтыя* словы, *гэтую* форму выбраў аўтар). Мастацкі аналіз верша павінен быць працэсам творчасці чытача, які «стварае» ў сваім уяўленні ўслед за паэтам вобразы верша, раскрывае асацыятыўныя сувязі слоў, захапляецца трапнасцю вобразаў і глыбінёй, шматзначнасцю паэтычнага слова. Мастацкі аналіз паэзіі паглыбляе чытацкую культуру, выхоўвае эстэтычны густ, развівае эмацыянальны свет пры адной умове: спасціжэнне верша павінна быць сапраўды мастацкім працэсам і адпавядаць вывучаемаму твору па эмацыянальным напружанні, нават па стылі маўлення настаўніка і вучняў.

Настаўніку прыходзіцца ўлічваць тое, што падлеткам складана, а часам і нецікава вывучаць лірыку на ўроку літаратуры. Таму неабходна шукаць прыёмы заахвочвання ўвагі, цікавыя, нетрадыцыйныя формы работы. Факультатыўныя заняткі ж абавязкова павінны быць займальнымі, захапляльнымі, нават святочнымі. Вядома, нялёгка пры гэтым пазбегнуць аднастайнасці, выклікаць цікавасць і ўтрымаць увагу вучняў. Таму раім настаўніку як можна шырэй выкарыстоўваць магчымасці сумежных відаў мастацтва: музыкі, жывапісу, архітэктуры, дэкаратыўнага мастацтва і т. д., тым больш, што жанравыя іх законы ў многім супадаюць. Акрамя таго, зварот да класічнага мастацтва далучае вучняў да скарбаў агульначалавечай культуры, развівае іх эстэтычны густ.

Пры вывучэнні лірыкі неабходна ўлічваць і той факт, што пытанне яе жанравай класіфікацыі з'яўляецца складаным і дыскусійным, асабліва ў дачыненні да сучаснай літаратуры. У класічным літаратуразнаўстве прыняты падзел лірыкі на вершы філасофска-медытатыўныя (медытацыя, пасланне, стансы, ямбы, філасофскі верш, элегія), велічальныя (ода, дыфірамб, панегірык, апалог, мадрыгал, гімн, эпітафія, рацэя, эпіталама), песенныя (раманс, песня, серэнада, марш, псалом, кантата, альба, баркарола, канцона), сатырычна-выкрывальныя (эпіграма, пародыя, інвектыва, сатыра). Такі падзел, у прыватнасці, падаецца ў даведніках па тэорыі літаратуры, у тым ліку і для маладых літаратараў, В. П. Рагойшам. У сённяшняй паэзіі большасць з гэтых жанраў не выкарыстоўваюцца ў сваім прамым значэнні. Аднак яўныя адзнакі некаторых класічных жанраў лірыкі можна вылучыць і ў сучаснай паэзіі, а з улікам таго, што ў наступных класах дзеці будуць вывучаць літаратуру ад старажытнасці і ў сусветным кантэксце, азнаёміцца з такой класіфікацыяй пажадана. У літаратуразнаўстве XX стагоддзя быў выпрацаваны і шырока распаўсюджаны падзел лірыкі на жанры ў адпаведнасці з тэмай твора, зафіксаваны, напрыклад, у «Паэтычным слоўніку» В. Кваткоўскага: грамадзянская, філасофская, пейзажная, інтымная (любоўная). Такі падзел, хоць і зручны для школьнай практыкі, аднак даволі ўмоўны, бо ў адным творы могуць спалучацца розныя жанрава-тэматычныя адзнакі.

Цікавыя і слушныя назіранні над праблемай сучаснага жанравага падзелу лірыкі прыведзены ў дапаможніку Г. К. Тычко «Асновы літаратурна-мастацкай творчасці»: «Дакладна вызначыць характэрныя рысы лірычных жанраў яшчэ цяжэй, чым эпічных. У сучаснай літаратуры такія тэрміны, як "ода", "элегія", "стансы" і інш. сталі сэнсава нявызначанымі. Можна згадаць, напрыклад, "Оду квітанцыі" А. Вярцінскага, "Стансы" В. Сахарчука, "Баладу роду" Алеся Пісьмянкова і інш. Можна сказаць нават, што лірычных жанраў столькі, колькі паэтаў. Жанрава-стылёвыя пошукі характэрныя ўсім літаратурам свету. І асабліва інтэнсіўна праходзяць яны, звычайна, на пераломе стагоддзяў.

Асаблівасцю лірычных вершаў з'яўляецца тое, што іх задача — не расказаць пра якую-небудзь падзею, а прымусіць чытача перажыць пэўныя эмоцыі. Гэта дасягаецца не толькі прамым выказваннем, колькі падборам вобразаў, пэўнай арганізацыяй рытму і гукаў, уважлівым выбарам лексікі. З пункту гледжання моўнай устаноўкі — гэта значыць, выкарыстання ў якасці выяўленчага сродку гукавога складу слова, яго асноўных сэнсаў і г. д. — вылучаюцца два віды лірычных твораў: творы напеўнага і творы гаварнога ладу».

Як зазначае далей Г. Тычко, большасць слоў у вершах напеўнага ладу не ўспрымаецца ў сваіх асноўных і дакладных сэнсах і не стварае канкрэтнага вобраза, але мы выразна адчуваем гукавую гульню, вялікую колькасць унутраных сугуччаў, якія выклікаюць пэўнае эмацы-

янальнае ўражанне (напрыклад, верш Янкі Купалы «Явар і каліна»). У вершы М. Багдановіча «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...») гэта ўражанне ствараецца зрокава-асязальнай карцінай далёкага Егіпецкага краю. Гук і эмацыянальная афарбоўка — толькі дадатковыя сродкі. І ў адрозненне ад купалаўскага верша, санет «не спявае», гэта твор гаварнога ладу.

«Вершы гаварнога ладу імкнуцца да дакладнасці выказвання, да выразнасці вобраза і выкарыстоўваюць перш за ўсё асноўныя сэнсы слова. Вершы ж напеўнага ладу будуюцца на тонкіх нюансах афарбоўкі слова, гульні гукаў. Гэтымі адрозненнямі ў пэўнай ступені абумоўлены і змест: у напеўных вершах перадаюцца няўлоўныя настроі, адчуванні, эмоцыі; вершы ж гаварнога ладу адлюстроўваюць роздум, заклік, карціны прыроды і г. д.»

Заўважым аднак, што Г. Тычко гаворыць пра вершы напеўнага і гаварнога ладу як пра віды, а не пра жанры лірычных твораў, таму ёсць сэнс знаёміць вучняў з класічнымі жанрамі лірыкі.

Настаўніку не варта абыходзіць увагай і прапанаваныя ў праграме і метадычных дапаможніках для вучняў і настаўніка творчыя заданні. Няхай вучні паспрабуюць свае сілы ў стварэнні прыгожага. Вядома, выяўленне іх творчых магчымасцей можа быць розным, часта нават і прымітыўным па мастацкіх вартасцях, але нават і пры гэтым яно будзе вучыць увазе да паэтычнага слова, выхоўваць павагу да сапраўднага паэтычнага таленту. Пры ўмелым і далікатным кіраўніцтве настаўніка, калі вучні давяраюць яму папярэдняе знаёмства са сваімі спробамі пяра, творчыя заданні, якія выконваюцца па жаданні вучняў, дапамогуць зрабіць вывучэнне лірыкі цікавым і захапляльным працэсам.

Пачынаць гутарку па тэме «Лірыка» варта з народнай песні як вытоку лірычных твораў. Вучні ўжо знаёміліся з народнымі песнямі ў папярэдніх класах, ведаюць пра іх падзел на каляндарна-абрадавыя і сямейна-абрадавыя, пра вобразнае багацце народнай песні. Школьнікі выконвалі ў папярэдніх класах заданне запісаць народныя песні ад старэйшых людзей, знаёміліся з выказваннямі пра народную песню, з выдатным творам М. Багдановіча «Апокрыф», які ў афарыстычнай форме характарызуе яе змест, прызначэнне і ролю ў жыцці народа. Таму няма неабходнасці вывучаць гэтую тэму як новую, варта паўтарыць тое, што вучні ўжо ведаюць пра народную песню, і звярнуць увагу на выяўленне ў ёй пачуццяў і перажыванняў чалавека, пагаварыць пра мастацкую дасканаласць і музычную спецыфіку гэтага жанру вуснай народнай творчасці, паслухаць песні ў аўдыёзапісах.

**Навучальная мэта** — узгадаць тое, што вучні ўжо ведаюць пра народную песню і акцэнтаваць увагу на тым, што гэты жанр — крыніца, выток лірычнай паэзіі; прааналізаваць верш П. Броўкі «Як ліст дубовы…», паказаць яго сувязь з фальклорам і жанравыя асаблівасці як філасофска-медытатыўнага верша.

**Выхаваўчая мэта** — прывіваць пачуццё любові да скарбаў народнай творчасці, эмацыянальную чуйнасць; далучыць вучняў да асэнсавання філасофскіх праблем сэнсу чалавечага жыцця.

Няхай вучні ўслухаюцца ў гучанне гэтага слова — лірыка. Яно ласкавае і мілае, як імя дзяўчыны, меладычнае і прыгожае, як журчанне ручайка, гордае, як вечавы звон, разважлівае, як уздых, што зусім заціхае да апошняга гуку. Сапраўды, лірыка здольная перадаць і пачуццё кахання, і захапленне прыродай, і грамадзянскія пачуцці, і сур'ёзныя філасофскія разважанні. Гэтае слова мы чулі з дзяцінства, але карыстаемся ім у гаворцы рэдка і з прыхаванай сарамлівасцю. Проста мы адчуваем у ім нешта такое, чым жыве і наша душа, якую раскрываць бывае няпроста, нешта, чым душа ратуецца і што ў сабе раўніва беражэ. Мы пазнаём у чужых радасцях і болю, сумненнях і разважаннях свае адчуванні і застываем у здзіўленні: адкуль ён, гэты паэт, усё пра мяне дазнаўся? А на самай справе наадварот — паэт расказаў нам пра сябе, раскрыў сваю душу...

Вывучаючы лірыку, мы будзем спасцігаць таямніцы чалавечай душы. Вучні ўжо сустракаліся з лірычнымі вершамі ў папярэдніх класах. Няхай успомняць паэтычныя творы, якія іх найбольш уразілі, і скажуць, што за пачуцці перадаюцца ў вершы.

Настаўнік скажа, што сапраўднай скарбонкай паэзіі, невычэрпнай яе крыніцай з'яўляецца народная песня, у якой народ на працягу многіх стагоддзяў назапашваў самыя разнастайныя пачуцці і перажыванні, выкліканыя і чалавечымі ўзаемаадносінамі, і светам прыроды, і паўсядзённай працай селяніна.

«Беларуская народная песня! Колькі ў ёй арыгінальных сюжэтаў, кантрастаў і настрояў! Тут тужлівая лірыка і нястрымная весялосць, пяшчотнае каханне і гнеўны сацыяльны пратэст, бяскрыўдны жарт і вострая сатыра, светлыя карціны прыроды...» Так сказаў пра народную песню Генадзь Іванавіч Цітовіч, славуты фальклярыст, стваральнік і мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору «Беларусь». Вучні могуць праслухаць у выкананні гэтага выдатнага калектыву беларускую народную песню «Зелянеюць, зелянеюць лугі-сенажаці...».

— Ці ведаеце вы іншыя мастацкія калектывы, якія рупліва збіраюць і апрацоўваюць народныя песні?

Вучні назавуць гурты «Песняры», якім доўгі час кіраваў У. Мулявін, і «Беларускія песняры», «Троіца», а настаўніку варта ўспомніць харавую капэлу імя Рыгора Раманавіча Шырмы, ансамблі «Свята», «Тосціца», іншыя фальклорныя калектывы. Да месца будзе праслухоўванне песні ў іх выкананні.

Можна спытаць у вучняў, на якія віды дзеляцца народныя песні (каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя, лірычныя) і вызначыць, да якога віду адносіцца праслуханая песня.

Затым трэба нагадаць словы нястомнага збіральніка фальклору народнага паэта Ніла Гілевіча, імя якога вучні ўжо ведаюць: «Народныя песні валодаюць магічнымі чарамі ўздзеяння на пачуцці людзей, бо нясуць у сабе самае дарагое і запаветнае з таго, што напаўняла народную душу, чым яна жыла і жывілася, чым яна пакутавала і цешылася, да чаго імкнулася і што адмаўляла».

Вучні праслухаюць гуказапіс народнай песні «Бяроза з лістом…».

— Аб якіх жа запаветных пачуццях гаворыцца ў песні «Бяроза з лістом...»?

Тэкст песні прачытае настаўнік. Пасля адказу вучняў на пастаўленае пытанне варта нагадаць ім, што гэта сямейна-абрадавая песня і выконвалася яна ў час вяселля.

Адказваючы на пытанне «Чаму ў песні зліваюцца ў адзінае цэлае вобразы бярозы і ліста, маці і дачкі?», вучні скажуць, што паміж гэтымі вобразамі са свету прыроды і чалавечага жыцця існуе падабенства: бяроза, як маці, нараджае лісток, гадуе і песціць яго, корміць сваімі сокамі, а потым лісток адрываецца ад галінкі і пакідае яе, як дзеці пакідаюць родны дом.

— Аб чым сведчаць пяшчотныя звароты, словы з памяншальна-ласкальным значэннем, якіх так многа ў песні?

Вучні падкрэсляць вялікую любоў маці і дачкі, шкадаванне перад расставаннем. Затым звернем увагу на словы песні аб тым, што восенню бяроза развітваецца з зялёным, а не з жоўтым лістом. Так у песні падкрэслена маладосць дачкі, якую восенню, у звычайны для вяселляў час, аддае замуж маці.

Закончыць гутарку пра народную песню можна чытаннем своеасаблівага наказу Ніла Гілевіча моладзі: «...Зрабіце для сябе, малады чалавек, абавязковым правілам: кожны дзень, хоць на некалькі мінут, вазьміце ў рукі зборнік народных песень або казак, прыказак або загадак, пагартайце, пачытайце ўважліва, удумліва, нават даўно знаёмае вам, нават тое, што нібыта ведаеце на памяць, прачытайце яшчэ раз — вы абавязкова адкрыеце для сябе нешта вельмі істотнае і каштоўнае — як у сэнсе разумення народнага жыцця, душы народа, так і ў сэнсе разумення сакрэтаў мастацкага майстэрства».

Настаўнік скажа, што вобраз дрэва і лістка часта сустрэнецца нам у лірычнай паэзіі і што такое разгорнутае параўнанне з’явы прыроды і чалавечых перажыванняў называецца паралелізмам.

Фальклорныя матывы, трывалыя народныя асновы чалавечага характару, мастацкія прыёмы, уласцівыя вуснай народнай творчасці, у тым ліку і паралелізм, выкарыстаны ў выдатным вершы П. Броўкі «Як ліст дубовы…».

Пасля першага чытання верша настаўнік прапануе вучням вызначыць тэму гэтага твора. Добра, калі ў дзяцей будуць розныя адказы на гэта пытанне.

Верш П. Броўкі «Як ліст дубовы…», на першы погляд, зусім не пра шчасце, не пра сэнс чалавечага жыцця, а пра звычайную з'яву прыроды. Але гэта толькі на першы погляд.

Настаўнік скажа, што верш нездарма названы «Як ліст дубовы…», бо твор — разгорнутае параўнанне жыццёвага шляху чалавека і існавання дубовага лістка. Падстава для такога параўнання вельмі лагічная: як і ўсё жывое, і лісток і чалавек з'яўляюцца на свет, перажываюць жыццёвыя буры і нягоды, і адыходзяць, пакідаючы свой след на зямлі. Але паэт выбраў для параўнання менавіта дубовы ліст, бо дуб — самае моцнае дрэва і лісткі яго трымаюцца на галінцы, нібы абараняючы яе ад сцюжы і ветру, нават зімой, пажоўклыя і засохлыя.

Малюючы вобраз дубовага лістка, П. Броўка ўдала ўжывае словы са значэннем колеру і гуку. Лісток восенню «*мядзяны*, *дужы»*, пазней за іншыя «між хмурай стыні ён *гарыць*» і *«звініць»* на ветры, калі *«грае»* мятлюга. Толькі ў ясны дзень вясновы, выканаўшы сваё зямное прызначэнне, убярогшы ад марозу галінку, лісток «*ціха»* падае на дол, саступае жыццёвую прастору «*зялёнаму»*, новаму лістку.

Вучні лёгка разумеюць выразны падтэкст: лісток — гэта лірычны герой верша, таму ім будзе цікава, якімі ж сродкамі ствараецца асноўны вобраз верша, праз якія метафары даносіцца да чытача яго філасофская ідэя. «*Віхуры гул і свіст*», «*трасуць яго вятры і сцюжы*», «*мятлюга грае*», «*злосна шчэрыцца мароз*» — гэтыя вобразы ўвасабляюць жыццёвыя нягоды, якія сустракаюцца на шляху кожнага чалавека.

Але верш гучыць бадзёра, аптымістычна (такой інтанацыі спрыяе і энергічны двухскладовы памер — ямб), змрочныя вобразы толькі ўзмацняюць агульны светлы настрой, бо мы ведаем — нягледзячы на суровую зіму, непазбежна прыйдзе ясны вясновы дзень, пераможа жыццё і зноў паўторыцца яго спрадвечнае кола. Чалавек, як і лісток, жыве недарэмна, ён — звяно ў вечным ланцугу пакаленняў, для якіх і трэба зрабіць усё, што зможаш. Шчасце не даецца чалавеку ў гатовым выглядзе, яго трэба дасягнуць. Усё залежыць ад нас саміх, ад нашых актыўных адносін да жыцця. Нездарма знакаміты нямецкі філосаф Артур Шапенгаўэр гаварыў: «Тое, што ёсць у чалавеку, бясспрэчна, важнейшае за тое, што ёсць у чалавека».

Такое адчуванне адвечнага і справядлівага жыццёвага закону, агульнага для ўсяго жывога, дае лірычнаму герою адчуванне ўпэўненасці, жыццёвай годнасці, спакою. Ён сапраўды шчаслівы, бо шчаслівы не толькі для сябе.

Пасля гэтага варта папрактыкавацца ў выразным чытанні твора. Калі ёсць неабходнасць, то ў якасці ўзору можна праслухаць адпаведны запіс з фонахрэстаматыі.

Чалавек павінен жыць не толькі для сябе, але і для будучых пакаленняў, тады яго жыццё мае сэнс, шчасце, спакой і ўпэўненасць. Да такой думкі падводзіць вучняў настаўнік.

Вобразы ліста і галінкі, так удала выкарыстаныя П. Броўкам, ужо сустракаліся вучням у народнай песні «Бяроза з лістом...». Дзецям будзе няцяжка ўспомніць, што ў народнай песні гэтыя вобразы сімвалізавалі маці і дачку, толькі там параўнанне раскрывалася ў тэксце. П. Броўка, беручы вобраз з фальклору, дае чытачу магчымасць самому падумаць і раскрыць падтэкст твора.

**Навучальная мэта наступных заняткаў** — паглыбіць уяўленні вучняў пра філасофска-медытатыўныя жанры лірыкі.

**Выхаваўчая задача** — фарміраваць адказнае, удумлівае стаўленне да жыцця, павагу да старэйшых людзей; развіваць літаратурныя здольнасці дзяцей.

Стымулюючы ўласную творчую актыўнасць вучняў, можна прапанаваць ім прачытаць верш М. Танка «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...» без апошняга радка («Калі ўсе могуць спадзявацца на цябе») і даць заданне дапісаць верш. Чытаючы верш-разважанне М. Танка, вучні звернуць увагу на тое, як мудра паэт прасочвае шлях станаўлення асобы: немаўля, якое ва ўсім залежыць ад маці, сапраўды яшчэ толькі намёк на чалавека, і нездарма, гледзячы на яго, людзі звычайна высвятляюць, на каго больш падобна дзіця. Маленькі чалавек расце, усё большае значэнне ў яго жыцці набываюць сябры, затым — каханне, невыпадкова паэт гаворыць, што «Ты толькі — паўчалавека, калі ва ўсім спадзяешся на любоў». Людзі ж прывычна называюць каханых сваімі «палавінкамі». Але калі ж усё-такі мы становімся самастойнымі?

Творчае заданне дапісаць апошні радок у філасофскім вершы М. Танка «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...» дапаможа вучням не толькі задумацца і самім паразважаць пра сэнс і заканамернасці чалавечага жыцця, але і адчуць, што напісанне такіх твораў патрабуе вялікага жыццёвага вопыту. Вучні звычайна дапісваюць апошнюю страфу верша так: «І толькі тады становішся чалавекам, калі ва ўсім спадзяешся на самога сябе». Тым больш цікава ім даведацца, як жа сказана ў паэта:

* * *

Ты яшчэ толькі намёк на чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на маці;

Ты яшчэ — чвэрць чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на дружбу;

Ты толькі — паўчалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на любоў, —

І толькі тады становішся чалавекам,
Калі ўсе могуць спадзявацца
На цябе.

Нездарма М. Танк нават разрывае апошні радок, каб падкрэсліць важную думку: кожны з нас адказвае за многіх іншых: за бацькоў, за сяброў, за каханне. Толькі тады чалавек мае права лічыць сябе самастойным чалавекам.

Вершы П. Броўкі «Як ліст дубовы...» і М. Танка «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...» адносяцца да філасофска-медытатыўных жанраў лірыкі (медытацыя, філасофскі верш). Акрамя названых вершаў, да філасофска-медытатыўных жанраў адносіцца элегія (напрыклад, верш А. Куляшова «Элегія»). Настаўнік можа пазнаёміць вучняў з гэтым вершам, звярнуўшы ўвагу на тое, што жанр элегіі шырока распаўсюджаны і ў музычным мастацтве («Элегіі» Эдварда Грыга і Жуля Масне). Агульная жанравая адметнасць твораў — іх сумны, меланхалічны настрой. Аднак сум можа быць і светлым: такім, напрыклад, як у вершы А. Куляшова «Бывай» — элегіі, якую васьмікласнікі вывучалі па праграме асноўнага курса літаратуры.

Вучням няцяжка будзе заўважыць, што творы П. Броўкі і М. Танка адрозніваюцца па рытмічнай арганізацыі: першы з іх — класічны сілаба-танічны верш, другі — верлібр, свабодны верш, з формай якога вучні ўжо знаёмыя з сёмага класа. Рытм у гэтых творах адрозніваецца: у першым ён ствараецца раўнамерным чаргаваннем націскных і ненаціскных складоў, а ў другім — паўтарэннем аднатыпных сінтаксічных канструкцый.

Вучні павінны былі засвоіць асноўныя вершаваныя памеры з папярэдняга класа, аднак гэтая тэма няпростая і вельмі важная і патрабуе пастаяннага замацавання, таму ёсць сэнс аднавіць у займальнай форме набытыя раней веды. Настаўнік скажа, што ў прыродзе законы гармоніі грунтуюцца на рытме — раўнамерным чаргаванні нейкіх моцных і слабых момантаў. У класічнай сілаба-танічнай паэзіі гэтыя моцныя і слабыя моманты — націск і яго адсутнасць. Мелодыя верша ствараецца роўнай колькасцю складоў у радку і раўнамерным чаргаваннем націскаў у іх. Націскны склад і адзін ці два ненаціскныя, якія да яго прымыкаюць — стапа (у старажытнасці, калі вершы выконваліся пад музыку, рытм адстукваўся стапой нагі, адсюль і назва). Гармонія класічных вершаў грунтуецца на варыяцыях пяці асноўных мелодый, якія мы пастараемся зрабіць больш гучнымі, выкарыстоўваючы прыёмы скандавання. Настаўнік можа «дырыжыраваць» гэтым скандаваннем, «малюючы» рукой ў паветры схемы чаргавання націскных і ненаціскных складоў (знак націска і паўкруг). Прычым паказаць мелодыю розных вершаваных памераў можна на прыкладзе вершаў аднаго паэта — М. Багдановіча, звярнуўшы ўвагу на віртуознае выкарыстанне ім магчымасцей сілаба-тонікі.

Чытаем верш «Па-над белым пухам вішняў...», звяртаем увагу на яго радаснае, бадзёрае гучанне, на эпіграф з П. Верлена: «Музыка перш за ўсё». Якая ж музыка гучыць у гэтым надзіва энергічным,

імклівым, нібы палёт матылька, вершы? Запісваем радкі, расстаўляем націскі ў іх, чытаем скандуючы (выдзяляючы голасам націскныя склады):

Б’**е́**цца, ў**е́**цца шп**а́**ркі, лёгкі
Сі́някр**ы́**лы м**а́**тыл**ё**к.

Гэтае бадзёрае, энергічнае «**та́**-та – **та́**-та – **та́**-та – **та́**-та» уласціва для харэя, сама назва якога паходзіць ад слова «танец». Вучням няцяжка будзе ўзгадаць падобныя словы «харэаграфія», «хора» і інш.

А вось мелодыя яшчэ аднаго двухскладовага памера – ямба – не такая энергічная, бо першы склад у стапе не націскны, а «слабы», ціхі, нібы ўздых. Настаўнік выразна чытае верш «Слуцкія ткачыхі», адзначае яго адметную мінорную інтанацыю, звязаную са зместам твора. Наступныя радкі запішам, расставім націскі і праскандуем:

Ян**ы́**, бязд**о́**льны**я́**, уз**я́**ты
Ткаць з**а́**лат**ы́**я паяс**ы́**.

Настаўнік скажа, што ў радку могуць з’яўляцца дадатковыя націскі ці пропускі націскаў. Праскандаваная мелодыя «та-**та́** – та-**та́** – та-**та́** – та-**та́** – та» уласціва для ямба. Назва гэтага вершаванага памера перакладаецца як «той, хто кідае». Атрымліваецца, што націск «кінуты» на другі склад.

Каб вучні лепш запомнілі назвы двухскладовых вершаваных памераў і парадак чаргавання націскных і ненаціскных складоў, можна запісаць наступныя схемы-апоры, абазначыўшы націскныя склады /, а ненаціскныя ∪:

/ ∪ / ∪ / ∪ / ∪ Харэй

∪ / ∪ / ∪ / ∪ / Ямб

Вершы, напісаныя трохскладовымі памерамі, гучаць звычайна больш спакойна, удумліва, разважліва. Настаўнік ці вучань прачытаюць верш М. Багдановіча «Раманс», звернуць увагу на светлы сум, якім прасякнуты твор, на яго прыгожае і суладнае гучанне. Пасля запісваюцца два першыя радкі верша, абазначаюцца націскныя і ненаціскныя склады, вызначаецца парадак іх чаргавання ў гэтай трохскладовай стапе. Радкі скандуюцца з дапамогай настаўніка:

З**о́**рка Вен**е́**ра ўзышл**а́** над зямл**ё**ю,
Св**е́**тлыя зг**а́**дкі з саб**о́**й прывял**а́**...

Такая схема чаргавання націскных і ненаціскных складоў уласціва для дактыля. Яго мелодыя: **та́**-та-та-**та́**-та-та-**та́**-та-та-**та́**-та. Назва

«дактыль» абазначае ў перакладзе з грэчаскай мовы «палец» і сугучна з прывычным словам «дактыласкапія» (адбітак пальцаў). Схема гэтага памера сапраўды ёсць на нашым пальцы, у якім тры суставы (склады), першы з якіх даўжэйшы (націскны).

Па тым жа ўзоры можна напомніць вучням сутнасць амфібрахія (гэта варта зрабіць на прыкладзе верша М. Багдановіча «На чужыне», які трэба прааналізаваць, звярнуўшы ўвагу на патрыятычны пафас твора і знаёмы вобраз-сімвал васілька). Назва «амфібрахій» складаецца з двух каранёў: амфі – (вакол, параўнай: амфітэатр) і брахос — кароткі. Атрымліваецца, што ў трохскладовай стапе **вакол** націскнога (доўгага) склада знаходзяцца два **кароткія.** Мелодыя амфібрахія спакойная і мінорная: та-**та́**-та-та-**та́**-та-та-**та́**-та-та-**та́**-та.

І, нарэшце, самы павольны вершаваны памер — анапест, якім часта пішуцца малітвы і развагі. Можна прачытаць верш М. Багдановіча «Як Базыль у паходзе канаў...», вызначыць асаблівасці яго зместу і формы (напісанае ў форме фальклорнага галашэння развітанне салдата з роднымі і Радзімай). Апошнія радкі запісваем, вызначаем націскныя і ненаціскныя склады, скандуем мелодыю: та-та-**та́**-та-та-**та́**-та-та-**та́**. Назва «анапест» складаецца з двух частак і абазначае «б’ю назад», г. зн., на апошні склад.

Як бачым, асноўных мелодый сілаба-танічнага верша толькі пяць, але яны могуць перадаць самыя разнастайныя перажыванні. Выбар вершаванага памера ўскосна звязаны са зместам і настроем твора.

**Навучальная мэта наступных заняткаў** — паглыбіць уяўленні вучняў пра велічальныя жанры лірыкі.

**Выхаваўчая мэта** — выхоўваць патрыятычныя пачуцці, гонар за сваю Радзіму, фарміраваць актыўную грамадзянскую пазіцыю падлеткаў.

У параўнанні з філасофска-медытатыўнымі жанрамі, вершы, напісаныя ў велічальных жанрах (ода, гімн, эпітафія, рэквіем), знаходзяцца на іншым эмацыянальным полюсе. Для іх характэрны ўслаўляльны змест і ўзнёслае, велічнае гучанне. Многія з вершаў грамадзянскай лірыкі, якія вучні вывучалі ў папярэдніх класах, з’яўляюцца одамі роднаму краю і свайму народу. Выразныя адзнакі оды як лірычнага жанру мае верш Р. Барадуліна «Мая Бацькаўшчына», які дзеці прачытаюць услых і прааналізуюць па пытаннях, прапанаваных у дапаможніку для вучняў.

Пасля знаёмства вучняў з вершамі, якія адносяцца да пейзажнай лірыкі (Я. Янішчыц «Прыедзь у край мой ціхі...», В. Зуёнка «Над зямлёю шугае верасень…») і параўнання іх з творамі пейзажнага жывапісу (Г. Вашчанка «Мір зямлі маёй», Л. Шчамялёў «Асенні кліч») вучні ў якасці самастойнага творчага задання могуць паспрабаваць напісаць верш ці празаічную прыродаапісальную замалёўку «Чатырохгранная ваза прыроды» (поры года). У такім выпадку наступныя

факультатыўныя заняткі будуць прысвечаны чытанню і абмеркаванню лепшых узораў (настаўнік павінен загадзя пазнаёміцца з вынікамі творчай работы, зрабіць тактоўныя парады вучням) і іх параўнанню з вершам А. Наўроцкага «Чатырохгранная ваза».

Для кожнай пары года паэт знаходзіць зрокава выразныя вобразы, афарбаваныя ў пэўны колер: зіма — «*белыя скруткі калючага дроту*»; вясна — «*бяроз зялёнае крылле*»; восень — «*залацісты прысак*». Толькі колер навальнічнага лета не вызначаны дакладна, бо ў ім, як у вясёлцы, сабраны ўсе фарбы жыцця.

У вершы мы не толькі «бачым», але і «чуем» кожную пару года. У гэтым паэту дапамагае майстэрскае выкарыстанне гукапісу: гукі завеі — «з, с, ш», бурленне веснавых ручайкоў — «б, р», жніво — «ж, дз», лістапад — «с, дз».

Нарастанне асенняй непагадзі паэт перадае праз трапную і выразную метафару: «Вецер свістаў спачатку ў дудачку, потым у дудку, а ўжо затым у дуду». Варта ўявіць сабе гучанне гэтых трох інструментаў — і адразу становіцца яснай задума паэта.

Твор А. Наўроцкага вучыць увазе да слова, да яго сэнсу і гучання, карпатлівай і ўважлівай рабоце над вершам, у якім не можа быць нічога выпадковага.

**Навучальная мэта наступных заняткаў** — пазнаёміць вучняў з вершамі пра каханне (Яўгенія Янішчыц «Ты пакліч мяне. Пазаві», Міхась Шушкевіч «Ты мне вясною прыснілася»), вызначыць іх мастацкія асаблівасці.

**Выхаваўчая мэта** — фарміраваць культуру інтымнага пачуцця.

Вывучэнне лірыкі патрабуе ад настаўніка і вучняў асаблівай тактоўнасці, душэўнай чуласці і ўзаемаразумення. Менавіта ў падлеткавым узросце такая размова неабходная і своечасовая, улічваючы і першы адпаведны эмацыянальны вопыт, і ўзроставыя асаблівасці дзяцей, і іх зацікаўленасць тэмай. Да прыходу сур'ёзнага пачуцця падлеткі павінны быць духоўна падрыхтаваны, упэўніцца ў прыгажосці, чысціні і высакародстве сапраўднага кахання. Вершы, якія прапануюцца вучням для чытання, прысвечаны пераважна першаму каханню, і гэта дае магчымасць правесці даверлівую размову. Важна не спазніцца, як часта бывае ў школе, са шчырай размовай пра каханне, пазнаёміць падлеткаў з узорамі высокага і вечнага пачуцця, увасобленага ў інтымнай лірыцы. Інакш на месца духоўнай пустаты можа прыйсці пошласць і грубасць.

Вучні павінны зразумець, што ў інтымнай лірыцы паэт дзеліцца з намі самымі патаемнымі, дарагімі пачуццямі, і трэба пастарацца ўспрыняць іх чула і з удзячнасцю. Толькі тады, калі чалавек навучыцца разумець іншых, ён можа спадзявацца, што нехта зразумее яго. Калі ж ён раўнадушны, то раўнадушша вернецца да яго расчараваннем і болем.

Калі мы хочам, каб пачулі нашу споведзь, трэба ўмець слухаць сэрцам чужыя перажыванні, тым больш, што паэт гаворыць і пра нашы пачуцці.

Вывучэнне інтымнай лірыкі мае найважнейшыя выхаваўчыя мэты — фарміраваць культуру пачуццяў, этычныя нормы ўзаемаадносін людзей, развіваць маральныя ідэалы, здольнасць да ўзаемаразумення і высакародства. Чытанне лірыкі кахання патрабуе асаблівай эмацыянальнай падрыхтаванасці, таму настаўнік павінен паклапаціцца пра выкарыстанне на ўроку твораў мастацтва, асабліва музычнага. Калі няма магчымасці праслухаць тыя творы, якія рэкамендуюць стваральнікі падручніка, можна выкарыстаць іншыя, адпаведныя па тэматыцы і жанравых асаблівасцях.

З вясною звязана ўяўленне пра юнацтва, светлыя надзеі, рамантычныя мары і спадзяванні і, вядома, пра каханне — самае прыгожае і чыстае чалавечае пачуццё. Яму прысвячаліся лепшыя творы класічнага мастацтва — у музыцы, жывапісе, літаратуры (прыклады настаўнік можа падабраць адвольна, на свой густ). Тэме кахання прысвечаны і вялікі пласт вуснай народнай творчасці. Вучні назавуць вядомыя ім народныя песні пра каханне, а настаўнік пазнаёміць з кнігай легендаў, паданняў і сказаў «Дрэва кахання» (Мінск, 1980), раскажа адну з легендаў («Пра Нёман і Лошу», «Паходжанне ракі Вілія» і інш.). Пажадана браць у якасці прыкладу легенды мясцовага паходжання. У ходзе ўступнай гутаркі можна праслухаць песні на вершы беларускіх паэтаў пра каханне, прадэманстраваць тэматычныя зборнікі інтымнай лірыкі, звярнуўшы ўвагу на сэнс і пяшчотнае гучанне іх назваў: «Зорка Венера» (зборнік вершаў беларускіх паэтаў), «Пяшчота» Г. Бураўкіна, «Каханне» Р. Баравіковай і інш.

На занятках, прысвечаных інтымнай лірыцы, ідзе гутарка пра ролю кахання ў жыцці чалавека, пра багацце і адметнасць першага пачуцця, яго значэнне для фарміравання асобы, месца ў жыцці чалавека. Тут зноў можна звярнуцца да класічнай літаратуры (вечныя вобразы закаханых — юныя Рамэа і Джульета). Дарэчы будзе выкарыстаць і матэрыялы рубрыкі «Рэха кахання» з газеты для падлеткаў «Раніца» (найбольш змястоўныя вучнёўскія допісы, у якіх падлеткі дзеляцца сваімі праблемамі, першым эмацыянальным вопытам).

Затым можна сказаць, што верш Я. Янішчыц «Ты пакліч мяне. Пазаві» таксама напісаны паэтэсай у юнацтве, калі яна была сямнаццацігадовай дзяўчынай. Чым жа адрозніваецца ён ад ужо вядомых вам твораў?

Пасля чытання верша настаўнікам вучні заўважаць, што верш напісаны ад імя лірычнай гераіні — жанчыны, якая чакае, што каханы пакліча яе за сабою. Яна ведае, што каханне прыносіць і шчасце, і трывогі, што яно — пачатак і аснова ўсяго.

Вучні прачытаюць верш і адкажуць радкамі з яго, што ж «пачынаецца з любві». Паўтор слоў «пачынаецца ўсё з любві» выдзяляе

галоўную думку верша аб значнасці пачуцця кахання, падкрэслівае маладосць паэтэсы, а паўтор першага радка ў канцы верша — яе спадзяванне на тое, што каханне абавязкова прыйдзе.

Вучням варта папрактыкавацца ў выразным чытанні верша, выкарыстаўшы прапанаваную партытуру:

Ты **пакліч** мяне. **Пазаві.** |
Там **заблудзімся** ў хмельных **травах.** |
Пачынаецца ўсё \/ з **любві,** |
Нават самая простая ява.
І тады душой не **крыві** |
На дарозе **жыцця** шырокай. |
Пачынаецца ўсё з **любві** —
Першы **поспех** і першыя **крокі.**
Прыручаюцца **салаўі**
**Там,** | дзе выбеглі ўдаль | канавы. ||
Пачынаецца ўсё **|** з **любві** —
**Адчужэнне,** і **боль,** і **нянавісць.**
Ты **пакліч** мяне. \/ Пазаві.
Сто **дарог** за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві.
А інакш | і **жыць** немагчыма.

Верш М. Шушкевіча «Ты мне вясною прыснілася» настолькі арганічна зліўся з музыкай Юрыя Семянякі, што для першага знаёмства з ім лепш праслухаць песню ў выкананні ансамбля «Песняры». Пасля вызначэння яе пяшчотнай, пранікнёнай інтанацыі і светлага настрою настаўнік скажа, што Міхась Шушкевіч працаваў рэдактарам на беларускім радыё і вершы пісаў для сябе. Аднойчы, звыш сарака гадоў таму, на вяршыню паэтычнага натхнення яго ўзняло каханне. Вось як успамінае сам М. Шушкевіч пра сваю маладосць:

«Я быў па-юначы закаханы. І сказаць ёй пра свае пачуцці было няпроста. Нават у той цёплы вечар, пад ноч на Купалле, калі я праводзіў яе дадому пасля работы. Мне хацелася з ёй ісці як можна далей, а яна нечакана мне сказала: “Ну, вось мы і прыйшлі. Дабранач!” — “Дабранач!” — прамовіў я. І ўсё ж я адчуваў сябе шчаслівым. Мне хацелася ляцець на крылах, а я ішоў ціха, каб не праліць тое светлае пачуццё, якое напаўняла мяне да краёў. Сёння я, думалася, нічога ёй не сказаў. Скажу ў наступны раз! А вось наступнага раза ўжо не было...»

У тую купальскую ноч і быў напісаны гэты верш «Ты мне вясною прыснілася». Вучні праслухаюць яго яшчэ раз у чытанні настаўніка і паспрабуюць падабраць твору сваю назву («Светлы сон», «Каханая» і інш.). Затым можна прасачыць, як з дапамогай эпітэтаў і параўнанняў ствараецца ў вершы адчуванне чысціні, лёгкасці, музыкальнасці. Настаўнік зверне ўвагу на тое, што эпітэты ў вершы выдзелены не-

звычайным парадкам слоў — інверсіяй. Успомніўшы сутнасць паняцця, вучні прывядуць прыклады інверсій з прачытаных раней вершаў.

Дома вучні падрыхтуюць вусны водгук на верш інтымнай лірыкі, які найбольш запомніўся.

## «ЦВЁРДЫЯ» ФОРМЫ ВЕРША

Гэтай тэме, якая будзе насычана тэарэтычным матэрыялам і творчымі заданнямі, можна адвесці два заняткі.

**Навучальная мэта першых заняткаў** — паглыбіць агульнае ўяўленне пра «цвёрдыя» формы верша, пазнаёміць са зместам і мастацкімі асаблівасцямі санетаў У. Шэкспіра, М. Багдановіча, М. Танка.

**Выхаваўчая мэта** — развіваць эстэтычны густ дзяцей, стымуляваць іх творчыя здольнасці.

Як вызначана ў «Паэтычным слоўніку» В. Рагойшы, «цвёрдыя формы верша — віды верша, якія ўзніклі пераважна ў сярэдневяковай класічнай паэзіі (у асноўным — італьянаскай, французскай, іспанскай), набылі інтэрнацыянальнае бытаванне і вызначаюцца пастаянствам вершаванага памеру, рыфмоўкі, колькасці і размяшчэння вершаваных радкоў. Сюды адносяцца санет, трыялет, секстына, тэрцына, актава, рандо, рандэль, рытурнэль, глоса і г. д.».

Акрамя таго, да «цвёрдых» форм лірыкі адносяцца жанры японскай паэзіі хоку і танка, якія нярэдка выкарыстоўваюцца ў сучаснай беларускай паэзіі.

Цвёрдыя (класічныя) формы лірыкі, апрацаваны талентам многіх пакаленняў паэтаў. Прайшлі стагоддзі, а законы іх гармоніі не змяніліся. Вершы, напісаныя па гэтых законах, працягваюць вабіць асаблівай прыгажосцю і вытанчанасцю, бо яны далучаюць нас да багацця сусветнай культуры. І сёння паэты ахвотна карыстаюцца гэтымі формамі верша.

Школьная праграма прадугледжвае знаёмства вучняў з вершамі, напісанымі ў форме санета, трыялета, актавы.

Адзін з самых дасканалых відаў верша, якія выпрацавала сусветная паэзія, — санет. Узнік ён у Італіі ў XIII ст., і паступова атрымаў шырокае распаўсюджанне ва ўсіх літаратурах свету. Сама назва верша (*sonetto* ад *sonare* — гучаць, звінець) таксама пайшла з італьянскай мовы. Санет складаецца звычайна з чатырнаццаці радкоў, аб’яднаных у два катрэны (чатырохрадкоўі) і два тэрцэты (трохрадкоўі). Найбольш распаўсюджаны яго памер — 5-ці-, радзей 4-х- або 6-цістопны ямб. Дзве рыфмы спалучаюць катрэны (**абба абба** ці **абаб абаб),** тры рыфмы тэрцэтаў размяшчаюцца ў залежнасці ад характару папярэдняй рыфмоўкі: **ввг дгд** ці **ввг ддг.** Такая будова санета цесна звязана з разгортваннем у ім паэтычнага зместу. У катрэнах ідзе развіццё тэмы,

у тэрцетах — кульмінацыя і развязка. Як адзначаў Максім Багдановіч у артыкуле «Санет» (1911), у першых васьмі радках «развіваецца тэма санета, а ў астатніх — заключэнне да яе; ставіцца пытанне і даецца адказ; малюецца абразок і даецца паясненне да яго». Асаблівая нагрузка падае на апошні тэрцэт, нават на апошні радок тэрцэта (т. зв. *санетны замок*), які па вобразнасці выказанай думкі павінен быць самым моцным у санеце. Больш таго, па законах класічнага санета апошняе слова ў ім павінна быць сэнсавым «ключом» да ўсяго твора. У той жа час ніводнае слова, выключаючы хіба службовыя, не павінна паўтарацца.

Як справядліва зазначае В. Рагойша, «строгая рэгламентаванасць санетнай формы, зразумела, ускладвае на паэта дадатковыя цяжкасці і значныя абавязкі, абмяжоўвае яго фармальныя пошукі. З другога боку, форма дысцыплінуе вершатворца, падштурхоўвае да лаканізму, афарыстычнасці вобразнага выказвання, абумоўлівае пругкасць, сэнсавую ёмістасць вершаванага радка. Вось гэта апошняе, а таксама эстэтычная дасканаласць, прыгажосць самой паэтычнай формы і прывялі да таго, што санет даволі хутка распаўсюдзіўся ў еўрапейскай (найперш італьянскай, іспанскай, партугальскай, французскай, англійскай), а затым і сусветнай паэзіі».

У беларускай паэзіі форма санета вельмі распаўсюджана: да яе звярталіся Сяргей Грахоўскі, Эдуард Валасевіч, Хведар Жычка, Рыгор Барадулін, Янка Сіпакоў, Мікола Федзюковіч, Таіса Бондар, Алег Мінкін, Соф’я Шах, Змітрок Марозаў і многія іншыя вершатворцы. Санет стаў адным з найбольш пашыраных класічных відаў беларускага верша. Існуюць цэлыя кнігі санетаў (так, у зборнік «Санеты» Алесь Звонак уключыў 170 твораў, у тым ліку сатырычныя санеты, санеты-байкі), вянкі санетаў, у якія, нібы кветкі, «сплятаюцца» 15 санетаў так, што кожны пачынаецца з апошняга радка папярэдняга верша, і нават вянок вянкоў санетаў (ён належыць пяру Змітрака Марозава і складаецца з 15 вянкоў санетаў).

Да таго часу, пакуль санет прыйшоў у беларускую паэзію, яго змест і форма сталі вельмі разнастайнымі. Напачатку санет быў прыналежнасцю выключна інтымнай лірыкі. Паступова тэматычныя і жанравыя рамкі яго пашыраліся. У Шэкспіра санет напоўніўся філасофскім зместам. З цягам часу тэматыка санетаў станавілася ўсё больш разнастайнай, і паступова зместавыя абмежаванні для гэтай формы верша перасталі існаваць.

У імкненні адступіць ад першапачатковых жорсткіх канонаў паэты пачалі ўносіць змены і ў саму мастацкую форму санета. У. Шэкспір, з санетам якога вучні знаёмяцца па школьнай праграме восьмага класа, пісаў санеты ў выглядзе трох катрэнаў і аднаго заключнага двухрадкоўя (**абаб вгвг деде жж**). Такая адметная форма нават атрымала назву *санета шэкспіраўскага тыпу*. Вучням няцяжка вызначыць

адрозненне яго ад кананічнага санета (абаб абаб ввг ддг), з узорам якога яны сустракаліся пры чытанні твора М. Багдановіча «Замёрзла ноччу шпаркая крыніца...»

Знаёмячы вучняў з асаблівасцямі санетнай формы, варта прапанаваць ім папрактыкавацца ў складанні рыфмаграм верша. Перад гэтым трэба напомніць, што такое рыфма.

Рыфма (ад грэчаскага слова «суразмернасць») — паўтаральная сугучнасць асобных слоў ці іх частак на канцы радкоў. Абазначыўшы аднолькавыя рыфмы аднолькавымі літарамі, атрымліваем рыфмаграму верша. У прывычных для вучняў чатырохрадкоўях (катрэнах) рыфмоўка бывае сумежнай (***аабб***), перакрыжаванай (***абаб***) і кальцавой (***абба***). Рыфмоўку традыцыйнага, напрыклад, багдановічаўскага, санета вучні запішуць наступнай формулай: ***абаб абаб ввг ддг***.

Самастойную работу па засваенні асаблівасцей формы санета можна правесці на прыкладзе верша М. Танка «У век наш рэвалюцыйны, штармавы...». Вучні падумаюць, як у вершы асэнсоўваецца праблема традыцыі і наватарства, якія знаёмыя прозвішчы называе аўтар у якасці сваіх літаратурных настаўнікаў, складуць рыфмаграму верша і паразважаюць аб прычынах шматвекавой папулярнасці гэтай класічнай формы верша.

Праўда, той жа М. Танк напісаў і «Антысанет», у якім у парадыйна-сатырычнай форме гаворыць аб празмернай рэгламентаванасці санета:

АНТЫСАНЕТ

Што сваёй Музе рупнай, працавітай
Я падару на схіле сваіх лет?
Мо з дрэва райскага прынесены ранет,
Пярсцёнак Палікрата срэбраліты?

Мо чару, поўную вясновага блакіту,
Ці нейкіх кветак палявых букет,
А мо гарэзу прыбяру ў санет —
У вопратку багіняў старажытных?

Як гэты вабны ўбор да твару ёй!
Чаму ж не радуешся, дарагая?
— Як мне ў ім дзіцё карміць, не знаю,

Як працаваць і цешыцца з табой,
Калі санет твой грудзі і стан мой
Чатырнаццаццю клямрамі сціскае.

Аднак чытач лёгка заўважыць, што верш напісаны ў санетнай форме, значыць, на самай справе магчымасці санета неабмежаваныя.

Паглыбляючы ўяўленні вучняў пра жанры лірыкі, варта сказаць, што «Антысанет» М. Танка — узор дасціпнай пародыі, у якой аўтар наўмысна змешвае высокае і побытавае, звычайнае. Пародыя адносіцца да сатырычна-выкрывальных жанраў лірыкі.

Падагульняючы размову пра санет, настаўнік скажа пра тое, чаму гэтая форма верша папулярная ў сучаснай беларускай паэзіі і прапануе вучням паспрабаваць напісаць санет прыродаапісальнага зместу.

Наступныя заняткі працягваюць знаёмства з класічнымі формамі верша.

**Навучальная мэта** — азнаямленне з творамі, напісанымі ў форме трыялета, актавы, хоку, танка, вызначэнне асаблівасцей іх формы.

**Выхаваўчая мэта** — прывіццё чуйнасці да прыгожага ў прыродзе і ў мастацтве, развіццё творчых здольнасцей дзяцей, далучэнне іх да культуратворчай дзейнасці.

Не меншай папулярнасцю, чым санет, карыстаецца ў сучаснай паэзіі і трыялет. Але перш чым вучні даведаюцца пра значэнне гэтага прыгожага і звонкага слова, можна прапанаваць ім памарыць пад цудоўную мелодыю П. Чайкоўскага «Зімовыя летуценні» і расказаць пра тое, якія ўяўленні выклікае музыка.

Настаўнік прапануе паслухаць «Трыялет» Д. Бічэль і параўнаць уражанні, што стварае музыка, з адчуваннямі, якія выклікае верш. Як і музыка, верш Д. Бічэль лёгкі, летуценны. Найлепш перадае яго настрой слова «светла», якое нездарма паўтараецца двойчы: «*Светла ў полі, светла на душы*». Метафары («*лёгкія сняжынкі ў цішы долу апускаюцца нясмела*», «*спіць сасна ў бухматым шалашы*») ствараюць уражанне спакою, цішыні і дабра, якімі запоўнены сусвет. Паўтор ключавога слова «*светла*», а таксама эпітэт «*бялютка-бела*» ўзмацняюць гэтае адчуванне, робяць зімовы малюнак дакладным і прыгожым.

Вучні выразна прачытаюць верш і вызначаць, што ён адносіцца да пейзажнай лірыкі. Прырода ў ім адухоўлена, нават сняжынкі паводзяць сябе, як людзі, «*нясмела*» апускаючыся долу. Паэтэса падкрэслівае еднасць чалавека і прыроды, а пра лірычную гераіню верша можна сказаць, што яна чалавек, багаты душою, летуценны і чуйны да прыгажосці ў прыродзе. Ёй спакойна і добра на сэрцы, гэта і перадаецца праз апісанне стану прыроды.

Затым настаўнік зверне ўвагу, што ў невялікім вершы Д. Бічэль некаторыя радкі аднолькавыя. Вучні скажуць, што першы і другі радок паўтараюцца ў канцы твора, прычым першы яшчэ і супадае з чацвёртым. Такім чынам, адзін радок паўтараецца тройчы, што і дало назву вершу. Трыялет (ад італьянскага слова *trio* — трое) — від васьмірадковага верша, у якім два першыя і два апошнія, а таксама першы і чацвёрты радкі аднолькавыя. Узнікла гэта форма верша ў XV стагоддзі ў Францыі і папулярная ў сучаснай, у тым ліку беларускай, паэзіі.

Радок, які паўтараецца тройчы, — ключавы, асабліва важны. Так, Д. Бічэль ён дазваляе стварыць асноўны зрокавы і слыхавы вобраз зімовага дня, перадаць настрой. Трыялет мае дзве рыфмы: у творы Д. Бічэль рыфмуюцца словы «*душы — цішы — шалашы*» і «*бела — нясмела*».

Вучням цікава будзе паспрабаваць свае сілы ў напісанні трыялета па двух апорных радках. Для прыкладу настаўнік можа ўзяць радкі з трыялета Я. Сіпакова «Ялта , Максім, кіпарысы»:

1 Ён навучыў, здаецца, гаварыць
2 Па-беларуску нават кіпарысы...
3 .........................................
4 Ён навучыў, здаецца, гаварыць
5............................................
6............................................
7 Ён навучыў, здаецца, гаварыць
8 Па-беларуску нават кіпарысы...

Пасля абмеркавання ў класе лепшых вынікаў творчай работы, з якімі настаўнік пазнаёміцца загадзя, трэба абавязкова прачытаць трыялет Я. Сіпакова поўнасцю ў класе і асэнсаваць яго.

Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы...
Барвінак на магільніку гарыстым
Ён навучыў, здаецца, гаварыць.
Паўднёва сонца плавіцца ўгары,
Зямля гарачая, нібыта прысак.
Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы...

З формай актавы вучні знаёмяцца па школьнай праграме на прыкладзе верша А. Грачанікава «Свяці, кахання чыстая зара!..». На факультатыўных занятках можна прачытаць актаву Н. Гілевіча «Нам разам трыццаць. Мы стаім на кладцы», прааналізаваць яе змест, які блізкі і зразумелы вучням, скласці рыфмаграму верша (абабабвв), паразважаць, чаму назва «актава» супадае з музычным тэрмінам:

* * *

Нам разам трыццаць. Мы стаім на кладцы.
Яна свавольна туфелькі зняла.
Падаўшы мне далонь, каб не сарвацца,
Студзёнай хваляй ногі абдала.
Пасля... Пасля: «Шчасліва заставацца!»
І без мяне да берага пайшла.
На белай кладцы мокрыя слядкі –
Як першай песні мілыя радкі.

Даволі распаўсюджаны ў сучасных беларускіх паэтаў, асабліва ў маладых аўтараў, такія формы верша, як хоку і танка, выпрацаваныя японскай паэзіяй. Менавіта для моладзі ўласцівы заканамерныя імкненні вучыцца на прыкладзе класічнай сусветнай літаратуры і адначасова эксперыментаваць у вершаванні.

Хоку (ці хайку) — бязрыфменны трохрадковы верш, у якім першы і трэці радок складаецца з 5 складоў, а другі — з 7 складоў. Такая надзвычайная сціслacць абумоўлівае сэнсавыя асаблівасці хоку: дакладнасць і лаканічнасць вобраза, узятага пераважна са з'яў прыроды, афарыстычную ёмістасць і шматзначнасць слова. Да хоку часта звяртаюцца сучасныя беларускія паэты:

Дыханне зямлі
ветрам і аблокамі
над намі плыве.
*(А. Глобус)*

Танка — бязрыфменны пяцірадковы верш. У першым і трэцім радках танка па пяць складоў, у астатніх — па сем. Як і для хоку, для танка характэрна вобразная глыбіня і шматзначнасць слова, асацыятыўнасць думкі і паэтычны зварот да з'яў прыроды. Першыя танка ў беларускай паэзіі належаць М. Багдановічу:

Усё знікае
І следу нат не кіне,
Як шэры попел
Ад чорнага агнішча,
Развеяны вятрыскам.

Заканчваючы размову пра жанры лірыкі, настаўнік скажа, што асноўнае ў паэзіі — не арыгінальнасць формы, а сапраўдны талент і яго адказнасць перад словам, багацце душы і адметнасць творчай індывідуальнасці, якая дасягаецца сур'ёзнай работай над сабой, у тым ліку і вучобай у прызнаных майстроў літаратуры.

## Літаратура

1. Майсейчык, А. А. Фарміраванне паняццяў аб родах і жанрах мастацкіх твораў / А. А. Майсейчык. // Народная асвета. — 1986. — №4. — С. 47—51.

2. Мяжэвіч, В. А. Класічныя (цвёрдыя) формы лірыкі ў сучаснай беларускай паэзіі / В. А. Мяжэвіч // Бел. мова і літаратура ў школе. — 2008. — № 5. — С. 58—63.

3. Наровчатов, С. Необычное литературоведение / С. Наровчатов. — Изд. 3-е. — М. : Дет. лит., 1981. — 366 с.

4. Рагойша, В. П. На шляху да Парнаса: Даведнік маладога літаратара / В. П. Рагойша. — Мінск : Маст. літ., 2003. — 153 с.

5. Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П.Рагойша. — 3-е выд., дапрац. і дапоўн. — Мінск : Беларус. навука, 2004. — 576 с.
6. Рагойша, В. П. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах / В. П. Рагойша. — Мінск., 2001.
7. Рагойша, В. П. Уводзіны ў літаратуразнаўства : Вершаванне : курс лекцый / В. П. Рагойша. — Мінск, 2004.
8. Энциклопедический словарь для юношества. Литературоведение от «А» до «Я». — М., 2001.

# ЭПІЧНЫЯ ЖАНРЫ

**Навучальная мэта** — паглыбіць уяўленне пра істотныя асаблівасці эпічных жанраў, пазнаёміць са зместам і мастацкай спецыфікай школьных і фантастычных аповесцей А. Бадака, В. Гапеева, Р. Баравіковай.

**Выхаваўчая мэта** — на прыкладзе твораў выхоўваць маральную адказнасць за свае ўчынкі, развіваць фантазію і творчыя здольнасці дзяцей.

Калі слова «лірыка» асацыіравалася ў нашым уяўленні з імем пяшчотнай дзяўчыны і несла ў сабе жаночы пачатак — эмацыянальнасць, чуллівасць, музычнасць, то слова «эпас» хутчэй нагадвае імя разважлівага, грунтоўнага ў сваіх дзеяннях мужчыны. Сапраўды, для эпасу характэрна ўзнаўленне знешніх у адносінах да аўтара, з’яў рэчаіснасці ў іх аб’ектыўнай сутнасці, паступова-лагічным (сюжэтным) іх развіцці (В. П. Рагойша). Эпічны твор характарызуецца няспешным апавяданнем пра падзеі, грунтоўным апісаннем характараў і ўчынкаў персанажаў, іх партрэтаў, падрабязным апісаннем побыту, абставін, малюнкаў прыроды, аўтарскімі адступленнямі, разгортваннем дзеяння ў значны часавы перыяд і ў разнастайнай прасторы.

Эпас мае разгалінаваную сістэму жанраў: казка, легенда, навела, нарыс, апавяданне, аповесць, раман, эпапея. У сваю чаргу яны таксама дзеляцца на разнавіднасці ў залежнасці ад крытэрыя класіфікацыі. Так, сучасны раман, як і сучаснае апавяданне, паводле тэматыкі бывае наступных відаў:

1) сацыяльны, які паказвае істотныя грамадскія з’явы;
2) псіхалагічны, які скіраваны на адлюстраванне духоўнага жыцця персанажаў;
3) аванцюрны, збудаваны на прыгодах і вострых сітуацыях;
4) фантастычны, які адлюстроўвае сітуацыі, якіх не можа быць у рэальным жыцці.

У творах малой формы (казкі, апавяданні і г. д.) звычайна адна нескладаная сюжэтная лінія, падзеі разгортваюцца за невялікі час,

у аповесцях сюжэтныя лініі могуць пераплятацца ў дзеянне, большае па аб'ёме, раман жа ахоплівае значны перыяд часу і адрозніваецца шматпраблемнасцю, наяўнасцю разгалінаванай сістэмы вобразаў-персанажаў. У адпаведнасці і памеры эпічных твораў розныя: ад некалькіх старонак да соцень і нават тысяч (як, напрыклад, у раманах Л. Н. Талстога).

А. Бадак у аповесці «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца» звяртаецца да падзей з жыцця свайго героя Сяргея Васілевіча, за вобразам якога ўяўляецца сам аўтар. Сяргей — здольны юнак, вершы якога друкуюцца ў рэспубліканскай газеце. Ён эмацыянальны і, як уласціва падлеткам у 15—16 год, закаханы ў аднакласніцу Кацю, якой падкладаў у кішэню курткі цукеркі (іменна ў гэты момант яго заўважыла тэхнічка і абвінаваціла ў крадзяжы), і ў маладую настаўніцу. Рэалістычна паказваючы падзеі і глыбока пранікаючы ў псіхалогію герояў, А. Бадак стварае драматычны канфлікт: падлеткі, не ўсведамляючы адказнасці за свае ўчынкі, палохаюць настаўніцу стрэлам з самапала... Толькі праз дзясяткі гадоў герой даведваецца, што настаўніца была цяжарная і страціла ў выніку таго жарту дзіця. У сталым узросце героя, ужо вядомага пісьменніка, запрашаюць на сустрэчу з вучнямі, сярод якіх — юнак, таксама разумны і таленавіты, які нядобра пажартаваў з настаўніцы, сфатаграфаваўшы яе ў няўдалай позе і размясціўшы фота ў інтэрнэце. Пісьменнік нібы пазнае сябе, калі пераконвае хлопца ў тым, што неабходна добра ўсведамляць адказнасць за свае дзеянні і што многае ў нашых учынках проста немагчыма паправіць. Хлопец жа аказаўся сынам тае настаўніцы Танечкі, у якую ў юнацтве быў закаханы Сяргей Васілевіч і якую падлеткі так бяздумна напалохалі.

Палемічныя развагі сучаснага васьмікласніка, у тым ліку пра літаратуру і мову, павінны выклікаць зацікаўленасць вучняў, з якімі ў дыскусійнай форме можна абмеркаваць выказаныя ў творы думкі.

Аповесць мае складаную кампазіцыю, у ёй выкарыстоўваюцца прыёмы, якія актывізуюць увагу чытача: вяртанне, забяганне наперад, «шахматнае» размеркаванне часу.

У творы ёсць многа лірычных адступленняў (пра ручку, бацькоўскую хату), якія непасрэдна не звязаны з развіццём дзеяння, але дапамагаюць зразумець характар апавядальніка, а значыць, і галоўнага героя твора. Паколькі тэкст твора ў дапаможніку для вучняў падаецца ў скарочаным выглядзе, настаўніку варта самому прачытаць на занятках гэтыя лірычныя адступленні і паказаць іх ролю ў аповесці.

Пераклікаецца з творам А. Бадака і аповесць В. Гапеева «Лёшкава каханне, або Віртуальнае дрэва рэальнасці», якая таксама вучыць маральнай адказнасці за свае ўчынкі і напісана на сучаснай «камп'ютарнай» мове. Сюжэт яе просты: Лёшка, сучасны падлетак, «жыве» ў інтэрнэце, сумленна зарабляе там грошы стварэннем праграм і тэкстаў

і нават вучыць свайму ўменню іншых. Сябар Юрыс вырашыў пажартаваць і, схаваўшыся за нікам «Ксенка», назіраў, як Лёшка закахаўся ў неіснуючую дзяўчыну.

Канцоўка аповесці незавершаная: пасля таго, як Юрыс прызнаўся ў падмане, Аляксей знікае і выключае мабільнік. Пытанне: «Дзе цябе шукаць, Лёшка?», будзіць трывожнае ўяўленне чытачоў.

Твор В. Гапеева ў жанравых адносінах цяжка назваць аповесцю, хоць сам аўтар і даў яму такое азначэнне. Усё ж для аповесці ўласцівы большы аб'ём, працягнутасць дзеяння ў часе і складаная сістэма персанажаў. «Лёшкава каханне, або Віртуальнае дрэва рэальнасці» — гэта прамежкавая паміж аповесцю і апавяданнем форма, вялікае апавяданне з адной выразнай сюжэтнай лініяй, што ўскладняецца толькі важнымі для разумення характару галоўнага героя ўспамінамі: пра няўдалы першы вопыт дзіцячай закаханасці ў аднакласніцу, якая ненаўмысна пакрыўдзіла Лёшку, звярнуўшы ўвагу на яго неахайнасць, і пра тое, як Лёшка выручыў аднакласніка Юрыса, узяўшы на сябе адказнасць за разбітую тым вітрыну.

Вобразы галоўных герояў выпісаны ў творы дастаткова перакананальна. Лёшкава дасведчанасць у камп'ютарных тэхналогіях і яго прывычка не губляць марна час у інтэрнэце выклікаюць павагу і аднакласнікаў, і дарослых. Аднак яго ўпэўненасць у тым, што «віртуальныя адносіны — зусім не віртуальныя. Самыя рэальныя» выклікае насцярожанасць. Юнак не ўмее будаваць адносіны з людзьмі. «Заўсёды ўбаку ад класа, ціхі, непрыкметны. З дзяўчатамі — ніколі і нідзе. На дыскатэкі школьныя не хадзіў. І калі мусова было ісці, то ўбаку дзе і прастойваў увесь вечар». Сябар Юрыс зусім іншы: ён таксама, як і большасць сучасных маладых людзей, ахвотна карыстаецца інтэрнэтам, аднак нязмушана і лёгка (часам здаецца нават, што празмерна лёгка, бяздумна) будуе адносіны з равеснікамі. Юрыс цэніць адносіны з Лёшкам: «А так сябар ён быў добры — з такім і маўчаць можна» — і вельмі хоча яму дапамагчы. «Юрыс усюды імкнуўся пацягнуць за сабой Лёшку, іншы раз гэта і ўдавалася. Адчуваў Юрыс, што Лёшка і хацеў бы быць разам з усімі, але ці то саромеецца сам сябе, ці то смеласці не хапае, баіцца, што неяк не так зразумеюць яго словы ці дзеянні». Аднак той спосаб, якім Юрыс вырашыў дапамагчы сябру і які здаваўся проста жартам, аказаўся псіхалагічна небяспечным і балючым. Прыдумаўшы ў інтэрнэце неіснуючую дзяўчыну Ксенку і нават размясціўшы пад яе імем чужую фатаграфію, Юрыс зрабіў сябру кепскую паслугу: той шчыра паверыў у існаванне Ксенкі і закахаўся ў яе. Ён, вопытны праграміст, канечне, мог бы і прадбачыць сітуацыю, аднак так здарылася таму, што хлопцу патрэбны былі менавіта жывыя чалавечыя адносіны і ўзаемаразуменне з дзяўчынай. Юрыс, выдаючы сябе за Ксенку, адчувае, што робіць нешта кепскае: «Выйшаў з Інтэрнэту, падуладны нейкаму шчымліваму адчуванню, што робіць непа-

трэбнае... не, патрэбнае, але нячэснае, нячыстае, што нельга так, што ён улез за гэтыя паўгадзіны ў самім жа распачатую непрыстойную гульню». Аднак спыніцца ў гэтай сітуацыі аказваецца не так проста, і ў выніку Лёшка атрымлівае сапраўдны псіхалагічны ўдар. Юрыс, «разгублены, бездапаможны», не ведае, дзе шукаць сябра, які ўцёк з дома на пошукі Ксенкі, не паверыўшы, што яна на самай справе не існуе.

Вучні, безумоўна, звернуць увагу на адметную мову твора, у якой значнае месца займае сучасны маладзёжны слэнг, насычаны камп'ютарнай лексікай, на вялікую ролю дыялогаў, якія ствараюць уражанне прысутнасці на інтэрнэтаўскім форуме, на адрасаваныя дарослым тлумачэнні для бацькоў і настаўнікаў (гэты прыём нібы далучае аўтара да юнай чытацкай суполкі і робіць яго «сваім»).

Аповесць вельмі своечасова даводзіць думку аб тым, што нельга «жыць» у падманлівым камп'ютарным свеце, замяняючы ім рэальныя чалавечыя адносіны.

Фантастычная аповесць Р. Баравіковай «Лён-Лянок, або Кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка» напісана на зусім іншым матэрыяле. Пісьменніца толькі адштурхоўваецца ад канкрэтных жыццёвых дэталяў і творыць з дапамогай фантазіі сваю рэальнасць, у якой касмічны карабль доктара Савіча наведвае сузор'е Рака і назірае за касмічнай катастрофай на планеце Гусляр. Вучням будзе цікава сачыць за лёсам зялёнага Дрэйка, за перамяшчэннямі ў часе хлопчыка Арцёма, якога ратуюць сябры Алік і Ната, за тым, як спагадлівы і смелы Арцём у нечым уплывае на ход гісторыі, дастаўляючы хлопчыку Лянку насенне лёну ў мінулыя часы.

Галоўная аўтарская ўстаноўка Р. Баравіковай вельмі важная: сусвет павінен грунтавацца на ідэалах дабра, справядлівасці і чалавечнасці. Таму аповесць «Лён-Лянок, або Кампакт-дыск ад зялёнага Дрэйка» выгадна вылучаецца сярод іншых твораў сучаснай фантастычнай літаратуры: у ёй няма касмічных войнаў, яна заснавана на пошуку гармоніі ў свеце, які не павінен быць варожым.

Знаёмства з фантастычнымі творамі з «Казак астранаўтаў» Р. Баравіковай («Венерын чаравічак», «Касач — кветка чароўных музыкаў») дапаможа вучням падрыхтавацца да творчага задання — напісання фантастычнай казкі-апавядання пра кветку Астру.

## Літаратура


1. Алейнік, Л. Нельга двойчы ўвайсці ў адну раку (аповесць Алеся Бадака «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца») / Лада Алейнік. // Полымя. — 2008. — №5. — С.111—166.

2. Верціхоўская, М. І. Кніга Р. Баравіковай «Казкі астранаўта» / М. І. Верціхоўская // Бел. мова і літаратура ў школе. — 2007. — № 1, 2.

3. Грыцаль, Т. М. Тэарэтыка-метадычныя асновы фарміравання паняцця пра жанр пры вывучэнні беларускай прозы ў старэйшых класах / Т. М. Грыцаль // Бел. мова і літаратура ў школе. — 2002 — №1 — С. 37—46.

4. Цітова, Л. К. Аналіз эпічнай творчасці ў сярэдніх класах / Л. К. Цітова // Урок літаратуры ў школе: Кніга для настаўніка / Пад рэд. М. А. Лазарука, В. У. Івашына — Мінск : Нар. асвета, 1995. — С. 74—79.

# ЛІРА-ЭПІЧНЫЯ ЖАНРЫ

**Навучальная мэта** — паказаць жанравыя асаблівасці ліра-эпічных твораў.

**Выхаваўчая мэта** — на прыкладзе тэкстаў твораў ажыццяўляць патрыятычнае і маральнае выхаванне вучняў.

У ліра-эпічных творах зліваюцца эпічны пачатак (сюжэт, наяўнасць вобразаў-персанажаў, адлюстраванне знешняга ў адносінах да аўтара свету) з лірычным (прысутнасць аўтара, яго асабістая ацэнка падзей, эмацыянальнасць і вобразнасць мовы, вершаваная форма). Ліра-эпічныя творы дзеляцца на жанры: паэмы, балады, байкі, прыпавесці. Іх жанравыя асаблівасці мы выявім пры чытанні і жанравым аналізе балады А. Лойкі «Юнак быў з-пад Слоніма родам...», байкі У. Корбана «Музыкальная камедыя», прыпавесці А. Вярцінскага «Мы, мёд і пчала».

Творчае заданне. Напісанне байкі або прыпавесці (у вершаванай ці празаічнай форме) на аснове жыццёвых уражанняў.

У аснову балады А. Лойкі «Юнак быў з-пад Слоніма родам...», як успамінаў сам паэт, пакладзены рэальны жыццёвы выпадак часоў Вялікай Айчыннай вайны, калі трагічная выпадковасць стала прычынай гібелі юнага партызана.

* * *

**Юнак** | быў з-пад **Слоніма** родам, |
У Слонім | прыйшоў **сувязным.** ||
Пазнаў яго | **солтыс** — **нягоднік**,
Данёс | у **гестапа** ↗аб ім. ||
Юнак адпіраўся, || нібыта, ↑ |
**У Слоніме** ён **першы** **раз**:
Прыехаў | на **рынак** па **жыта**, ↑
Завуць жа || — **Іван** **Сарвас**.
«**Сарвас**?!» — глушаць **гумай**, | **як громам**. —
Ты думаеш, | **дурняў** **знайшоў**?! ↗||
Ад солтыса нам **вядома**: →
— Ты — **Сцёпка Юргель** з Байкоў...” || →
«Юргель?.. ↑ Пра такога || не **чуй я**!

**Байкі**?.. ↑ || **Не быў у** Байках!»
**Дзень, ноч** || гестапа **лютуе**, ↑
**Дзень, ноч** | **б'е** | юнака... ||↓
**А хлопец** | **нічога** не кажа... ||
**Задумаўся** обер тады,
**Ашчэрыўся обер**: | «**Гэй** ↗, **стража,** ↗||
Даць **маці** яго **сюды**!» ↑|
«**Матуля**?! Яна...» ↓
**Стаяла** |
**Без хусткі**, уся || ў **сівізне**...
О, || толькі б яна || **не сказала**!
**Не пазнавай** | мяне!.. ||
«Ну, | **матка, просім, сядайце**!..
Ён — | **сын твой**?.. Ён| **клікаў вас** ↑ ...»
Ледзь чутна | **шаптала** маці:
«Я | бачу яго ||
**першы раз**!»
Обер | **вушам** | не верыць,
**Обер** | **не верыць вачам**, ↑ — |
**Маўчаць** | у паўзмроку шэрым, ||
**Маці** і **сын** маўчаць...
«Прыгледзься **лепей**, || **старая**!..
Дык, значыць, | сын **не твой**?.. ||
Гэй, **стража, сабаку** з двара іх ||
Пусціце сюды | ў **пакой**!» ||
Вялізны **пёс віславухі** ||
Наёршыў на обера **поўсць**. ||
Пасля, | **скавычучы** глуха, |
**Да ног** | Сцяпана папоўз, |
Хвастом || **завіляў** і **рукі** |
Сцяпану | **лізаць** пачаў...
«**Гут**», — обер здаволена буркнуў.
**Сцяпан** | **зацята** маўчаў...
**Расстрэльвалі** іх || уранку — ||
**Маці** і **сына** || з Байкоў. |
Быў разам **з імі сабака**, |
На крок ад іх | **не адышоў**. ||
Калі ж і **яго** падкасілі,
**Ён**, | перш чым навек **анямець**, |
**Завыў** яшчэ раз на магіле, |
**Аб тым**, || што || не мог | разумець. ||

Настаўнік выразна прачытае баладу А. Лойкі «Юнак быў з-пад Слоніма родам...». Правяраючы першае ўспрыманне твора, ён задасць

пытанне, што ж стала прычынай гібелі партызанскага сувязнога. Пры адказе на пытанне трэба падкрэсліць, што праз мастацкую дэталь (паводзіны сабакі) падкрэсліваецца звярыная сутнасць фашызму.

Вучням няцяжка будзе заўважыць, што гэты твор мае адзнакі эпічнага — у ім ёсць напружаны сюжэт. Вучні вызначаць яго завязку (арышт юнака, здзекі ў гестапа, сустрэча з маці), кульмінацыю (момант, калі хлопца пазнаў сабака), развязку (расстрэл партызанскай сям'і). У адрозненне ад ужо вядомых вучням эпічных твораў, сюжэт тут развіваецца вельмі імкліва і нечакана.

Наяўнасць персанажаў — таксама адзнака эпічнага твора. Пры характарыстыцы Сцёпкі Юргеля і яго маці неабходна падкрэсліць іх стойкасць, гераізм, нязломнасць перад фашыстамі, што перадае ўсенародны характар справядлівай барацьбы партызан. Невыносна цяжка было маці, якая, убачыўшы акрываўленага, скатаванага сына, ледзь чутна прашаптала, што не ведае яго. Гэты шэпт і перадае яе неймавернае эмацыянальнае напружанне.

У баладзе выразна адчуваецца асоба аўтара — гэта прыкмета лірычнага твора. Так, солтыса (вясковага старасту) паэт называе нягоднікам, дзеянні гестапаўцаў перадае праз дзеясловы з выразнай адмоўнай ацэнкай: «*гестапа лютуе*», «*глушаць гумай, як громам*», «*ашчэрыўся обер*».

Да хлопца ж і яго матулі (так ласкава сказана ў творы) аўтар ставіцца са шчырым хваляваннем, ганарыцца іх стойкасцю.

Рэплікі ў творы супрацьлеглыя па інтанацыі: пытальна-клічныя — перадаюць раз'юшанасць фашыстаў і іх спробу лісліва ўгаварыць маці; спакойна-разважлівыя — нязломнасць партызана, ледзь чутны шэпт маці — невымерны боль за сына. Аўтарская ж інтанацыя вызначаецца мужнай стрыманасцю, за якой — уся трагічнасць падзеі.

Вучні ўжо дастаткова падрыхтаваныя папярэднімі тэмамі, каб вызначыць, што дадатковую ўзрушанасць баладзе надаюць шматлікія паўторы. Затым яны выразна прачытаюць баладу і параўнаюць уражанні ад яе і ад карціны Сяргея Герасімава «Маці партызана». Неабходна падкрэсліць, што мастак узвялічвае вобраз простай сялянкі, яе нязломнасць перад фашыстам, які выглядае пачварна, нават карыкатурна.

І ў баладзе, і ў карціне бесчалавечная сіла фашызму і нават смерць аказваюцца пераможанымі сілай чалавечага духу.

## Літаратура

1. Каяла, У. І. Станаўленне і развіццё жанру байкі / У. І. Каяла. — Гродна, 2002.

2. Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. — 2-е выд. — Мінск, 1982.

3. Чернец, Л. В. Литературные жанры (проблемы типологии и поэтики) / Л. В. Чернец. — Мінск, 1982.
4. Штэйнер, І. Ф. Балада: генезіс, эвалюцыя, перспектыва жанру / І. Ф. Штэйнер. — Мінск, 2003.
5. Штэйнер, І. Ф. Беларуская балада: Вытокі жанру і паэтычная структура / І. Ф. Штэйнер. — Мінск, 1989.
6. Энциклопедический словарь для юношества. Литературоведение от «А» до «Я». — М., 2001.

## ДРАМАТЫЧНЫЯ ЖАНРЫ

Драма (ад грэчаскага слова «дзеянне») — род літаратуры, які адлюстроўвае жыццёвыя з'явы праз паказ непасрэднага дзеяння. Асноўныя драматычныя жанры — трагедыя, трагікамедыя, фарс, вадэвіль, сатырычная і лірычная камедыя, гістарычная, сацыяльная, бытавая драма і г. д.

Драматычны твор пішацца для пастаноўкі на сцэне. Таму драма як род літаратуры, прызначаны для сцэнічнага ўвасаблення, мае свае спецыфічныя асаблівасці: вострая канфліктнасць дзеяння, дыялагічная форма, выбарачны паказ асобных, самых напружаных эпізодаў дзеяння, дзяленне на акты (дзеі) і сцэны (з'явы), наяўнасць аўтарскіх рэмарак, насычанасць мовы твора падтэкстам.

П'еса ўвесь час павінна трымаць гледача ў напружанні, поўнасцю захопліваць яго ўвагу. Таму і падзеі паказваюцца востраканфліктныя, і дзеянне развіваецца імкліва, і маналогі персанажаў павінны быць напружанымі і не вельмі вялікімі. Затое мова дзейных асоб заўсёды насычана падтэкстам, і гэта павышае далучанасць гледача да таго, што адбываецца, робіць яго сааўтарам твора. «Слову без падтэксту няма чаго рабіць на сцэне», — гаварыў класік тэатральнага мастацтва К. Станіслаўскі.

Развіццё сюжэта і кампазіцыя драматычнага твора таксама прадвызначаны яго сцэнічным характарам. Спектакль звычайна ідзе 2—3 гадзіны і мае адзін ці некалькі антрактаў — перапынкаў, у час якіх увага наведвальнікаў тэатра пераключаецца на іншае. Значыць, каб захаваць інтрыгу, перапынак павінен рабіцца ў час асаблівай зацікаўленасці гледача. Сюжэт залежыць не толькі ад падзелу на дзеі, паміж якімі робіцца перапынак, але і ад падзелу на з'явы, якія мяняюцца ў залежнасці ад з'яўлення новых асоб ці неабходнасці памяняць дэкарацыі.

Драма пішацца ў дыялагічнай форме, і аўтар ў ёй знешне нібы адсутнічае. Аўтарская пазіцыя непасрэдна выяўляецца толькі ў рэмарках і ў характарыстыках герояў, у пераліку дзейных асоб. Аднак трэба

ўяўляць, што кожную рэпліку і дзеянне героя прыдумаў аўтар, уклаўшы ў яе ідэйны сэнс.

Мова герояў драматычнага твора адрозніваецца не толькі падтэкстам, але і асаблівай выразнасцю, эмацыянальнасцю і «пазнавальнасцю», яна, разам з дзеяннем, з'яўляецца важным сродкам самахарактарыстыкі персанажа.

І, нарэшце, аўтар павінен разлічваць на тое, што ў глядзельнай зале — розныя людзі, і ўсім ім хочацца атрымаць задавальненне ад наведанага спектакля. Таму змест п'есы звычайна разлічаны на шырокую аўдыторыю.

## Запрашэнне ў тэатр[1]

Ці запрашалі вас калі-небудзь у тэатр? Калі запрашалі, то вы памятаеце, з якім святочным і прыўзнятым настроем чакалі сустрэчы з загадкавым і вельмі прывабным светам. Гэта — прадчуванне цуду.

У свеце тэатра ўсё незвычайнае. Вы бачыце дэкарацыі, намаляваныя мастаком і зробленыя ў тэатральных майстэрнях. Бачыце персанажаў, якіх прыдумаў драматург і сыгралі артысты. Але, гледзячы на сцэну, вы раптам забываецеся і пра тэатральныя дэкарацыі, і пра артыстаў. Вы перажываеце разам з героямі спектакля іх няўдачы, радуецеся перамогам.

Не выходзячы з глядзельнай залы, вы можаце здзейсніць падарожжа ў іншую краіну і ў любую эпоху. Тэатр можа вярнуць вас на многа стагоддзяў назад і, паказваючы падзеі далёкага мінулага, зрабіць іх блізкімі і зразумелымі. Мастацтва тэатра дапамагае зазірнуць і ў будучыню, а галоўнае — вучыць вас бачыць прыгожае ў жыцці і ў людзях.

Слова «тэатр» у перакладзе з грэчаскай мовы абазначае відовішча, значыць, нешта цікавае і захапляльнае. Гэта від мастацтва, у якім рэчаіснасць адлюстроўваецца праз сцэнічнае дзеянне, ажыццёўленае акцёрамі перад гледачом. Як і любы іншы від мастацтва, тэатр стварае вобраз — мастацкі адбітак жыцця, прыдуманы з дапамогай фантазіі і сагрэты аўтарскім пачуццём. Толькі аўтараў у тэатральнага вобраза многа і сродкі яго стварэння надзвычай разнастайныя.

Сваю працу ў падрыхтоўку спектакля ўкладваюць драматургі, рэжысёры, кампазітары, мастакі, балетмайстры, касцюмеры, грымёры, бутафоры. І кожны вечар на тэатральную сцэну выходзяць сапраўдныя чараўнікі тэатра — артысты, каб сілай свайго таленту ажывіць літа-

---

[1] Пры падрыхтоўцы раздзелаў «Запрашэнне ў тэатр», «Роздум перад спектаклем» і «Спектакль» выкарыстаны матэрыялы падручніка І. М. Слесаравай, М. А. Лазарука, В. І. Русілкі «Беларуская літаратура. 8 клас» (2006 год).

ратурных герояў, перадаць гледачу веру ў ідэалы дабра. У оперным спектаклі артысты з дапамогай мастацтва спеваў раскрываюць свет сваіх герояў, у балетным — пачуцці, думкі, перажыванні чалавека перадаюцца мовай танцавальных рухаў, у лялечным — бяруцца ў памочнікі лялькі, у драматычным тэатры персанажы на сцэне паводзяць сябе як у жыцці: гавораць, смяюцца, плачуць і г. д.

Такім чынам, мы прыйшлі ў тэатр!

## Роздум перад спектаклем

Пакуль не пачалося сцэнічнае дзейства, згадаем, адкуль прыйшоў да нас тэатр.

Вытокі беларускага тэатральнага мастацтва знаходзяцца ў глыбокай старажытнасці — у народных гульнях, абрадах, ігрышчах, якія былі багата тэатралізаваныя, суправаджаліся спяваннем народных песень, пераапрананнем. Так, на Каляды людзі пераапраналіся «казой», «мядзведзем» і хадзілі з песнямі ад хаты да хаты. Гэты звычай шмат дзе захаваўся і сёння. Пераапранутыя людзі спрабавалі не толькі спяваць, але і разыгрываць невялікія смешныя сцэнкі з народнага жыцця. З гэтымі кароткімі вясёлымі спектаклямі-інсцэніроўкамі калядоўшчыкі вандравалі не толькі ад хаты да хаты, але з адной мясціны ў другую. Таму іх пачалі называць вандроўнымі акцёрамі або скамарохамі. Яшчэ іх называлі гудцамі, плясцамі і інш.

У XVI—XVIII стагоддзях на Беларусі было шмат разнастайных духоўных, рэлігійных школ, іх навучэнцы рыхтавалі і ставілі невялікія спектаклі. Гэтая з’ява атрымала назву школьнага тэатра. Школьныя тэатры існавалі ў Мінску, Віцебску, Магілёве, Полацку, Оршы, Слуцку, Нясвіжы, Слоніме, Навагрудку і іншых гарадах.

Школьны тэатр праіснаваў на Беларусі да XIX стагоддзя. Ён зрабіў станоўчы ўплыў на развіццё прафесійнага тэатра, спрыяў з’яўленню шматлікіх п’ес на фальклорнай аснове. Адна з такіх п’ес — камедыя Віталя Вольскага «Несцерка».

Найбольш папулярным відам народнага тэатра была батлейка (слова «батлейка» паходзіць ад назвы горада Віфлеем ці Бэтлеем, дзе, паводле біблейскага міфа, нарадзіўся Хрыстос) — вандроўны лялечны тэатр.

Батлейка спачатку мела рэлігійны характар, у ёй разыгрывалася толькі адна п’еса — «Цар Ірад», створаная па біблейскай легендзе. Злы Ірад са з’яўленнем Хрыста павінен быў страціць сваю ўладу. Таму ён загадвае знішчыць усіх нованароджаных хлопчыкаў. Але потым атрымлівае заслужаную адплату.

Аднак адзін і той жа сюжэт не мог доўга захапляць гледачоў, і батлейшчыкі пачалі ўводзіць ў п’есу «Цар Ірад» інтэрмедыі, бытавыя

сцэнкі камедыйнага характару. Сцэнкі гэтыя карысталіся вялікай папулярнасцю і ўрэшце рэшт зусім выцеснілі п'есу «Цар Ірад». Так узнік лялечны тэатр.

У XVII — першай палове XIX стагоддзя на Беларусі пачалі стварацца першыя прафесійныя тэатры. Гэта былі прыватныя тэатры, якія адкрывалі магнаты — Агінскія, Радзівілы, напрыклад. Існавалі такія тэатры ў Нясвіжы, Слоніме і іншых гарадах. Звычайна артыстамі ў іх станавіліся таленавітыя прыгонныя сяляне, якіх рыхтавалі спецыяльна запрошаныя з-за мяжы майстры.

Найбольшага развіцця тэатральнае мастацтва дасягнула ў XX ст. Напачатку ў Беларусі складваліся аматарскія тэатральныя калектывы, напрыклад пад кіраўніцтвам Ігната Буйніцкага, Уладзіслава Галубка. Нарэшце ў 20-я гады XX ст. пачалі ўзнікаць прафесійныя тэатры.

Але вось-вось пачнецца спектакль!

## Спектакль

Гэта слова ў перакладзе з лацінскай мовы абазначае «відовішча». Спектакль — твор тэатральнага мастацтва, падрыхтаваны і паказаны тэатральным калектывам, які ўзначальвае рэжысёр-пастаноўшчык.

Падрыхтоўка спектакля пачынаецца з выбару п'есы. Затым ідуць рэпетыцыі — чыткі па ролях, на якіх рэжысёры і акцёры вызначаюць асноўную ідэю п'есы, абмяркоўваюць прапанаваныя драматургам абставіны, працуюць над тэкстам, вобразамі. Затым у рэпетыцыйным памяшканні вызначаецца выгляд будучых дэкарацый, у час рэпетыцый прыдумваюцца мізансцэны — размяшчэнне акцёраў у той ці іншы момант спектакля. Да гэтага часу павінна быць падрыхтавана і музычнае суправаджэнне. Развучваюцца танцы, песні, розныя трукі, калі яны задуманы рэжысёрам. Толькі пасля гэтага рэпетыцыі пераносяцца на сцэну.

А ў гэты час ідзе напружаная праца ў вытворчых цэхах тэатра. Спачатку на аснове рэжысёрскай задумы мастак-пастаноўшчык рыхтуе макет і чарцяжы дэкарацый, мастак па касцюмах — эскізы касцюмаў. Майстры працуюць над загатоўкамі будучых дэкарацый, мастакі-дэкаратары размалёўваюць іх. У мэблевым цэху вырабляюць мэблю для спектакля, у бутафорскім — прадметы, якімі будуць карыстацца акцёры на сцэне, у пашывачным — касцюмы і г. д.

Вынік усёй працы творчага калектыву — генеральная рэпетыцыя, якая ідзе як гатовы спектакль. І толькі пасля гэтага выпускаюцца афішы аб прэм'еры (так называюць звычайна першыя дзесяць спектакляў), тэатральныя праграмкі і запрашэнні.

У спектаклі няма нічога выпадковага, кожная дэталь мае свой, часта сімвалічны сэнс, працуе на стварэнне вобраза.

З класічным творам беларускага тэатральнага мастацтва — п'есай В. Вольскага «Несцерка», якая доўгі час была ў школьнай праграме і добра распрацавана ў метадычнай літаратуры, вучні могуць пазнаёміцца самастойна. Пажадана было б наведаць адпаведны спектакль у Акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа ці прагледзець яго відэазапіс. А вось п'есу У. Бутрамеева «Новыя прыгоды Несцеркі» варта інсцэніраваць з удзельнікамі факультатыва на школьнай сцэне. Па жанравых асаблівасцях гэта рымейк — твор, у якім выкарыстаны сюжэты ці матывы з іншых твораў, зроблена іх пераробка ці адаптацыя. Перш за ўсё тут запазычанне галоўнага героя, прычым запазычанне шматразовае: В. Вольскі ўзяў свайго Несцерку семдзясят гадоў назад з фальклору, а затым гэты ж персанаж стаў галоўным у камедыях Г. Марчука і У. Бутрамеева, прычым нават назву драматургі выбралі аднолькавую: «Новыя прыгоды Несцеркі». У творы У. Бутрамеева адзін галоўны герой — Несцерка — і шэсць каларытных другарадных персанажаў: пан Пшэбыеўскі, Бургамістр, Пятро Кудрачок, яго дачка Кацярына, Малання і Брындзюкоўна. Несцерка ў У. Бутрамеева — дасціпны, знаходлівы, практычны селянін, які вызначаецца народнай мудрасцю і аптымізмам. Варта заўважыць, што да гэтага вобраза У. Бутрамееў звяртаўся даўно: адзін з першых яго твораў — аповесць «Дзе свята, там і я, або Казка-байка пра тое, як жыў, па свеце цягаўся, памёр і жывы застаўся лоўкі мужык Несцерка». Гэта таксама, па вызначэнні М. Тычыны, «карнавальны рымейк-парафраза, характэрны для народнай смехавай культуры». Перад першым самастойным чытаннем п'есы У. Бутрамеева вучні выберуць персанаж, ролю якога ім хацелася б выконваць (настаўнік скажа, што ў гумарыстычным творы лепш і больш ярка «выпісаны» адмоўныя персанажы, і акцёрам лягчэй і цікавей іграць характарныя ролі, якія выклікаюць бурную рэакцыю гледачоў і запамінаюцца імі). Перад калектыўнай чыткай п'есы настаўнік высвятліць, якімі вучням уяўляюцца выбраныя імі персанажы, зробіць неабходныя ўдакладненні і размяркуе ролі. Наступныя заняткі праходзяць у форме рэпетыцый, у ходзе якіх удакладняецца ідэйны сэнс твора і характарыстыка вобразаў. Абмяркоўваюцца дэталі партрэтаў, дэкарацыі, грым, неабходныя бутафорскія дэталі. Апошняя рэпетыцыя перад спектаклем абавязкова праводзіцца ў грыме і гатовых дэкарацыях. Да спектакля вучні распрацуюць і выканаюць афішу, праграмкі і запрашэнні. Вядома, праца па падрыхтоўцы школьнага спектакля патрабуе ўзаемадзеяння з выкладчыкамі іншых дысцыплін (музыкі, выяўленчага мастацтва, класнымі кіраўнікамі), а таксама з вучнямі старэйшых класаў. Аднак намаганні гэтыя шчодра ўзнагароджваюцца набытым узаемаразуменнем з вучнямі, адчуваннем свята і значнасці зробленай справы і тым, што вучні глыбей спасцігнуць эстэтычную спецыфіку драматургіі, стануць падрыхтаванымі аматарамі тэатральнага мастацтва.

## Літаратура

1. Васючэнка, П. Сучасная беларуская драматургія / П. Васючэнка. — Мінск, 2000.

2. Катышева, Д. В. Вопросы теории драмы: действие, композиция, жанр / Д. В. Катышева. — СПб., 2001.

3. Лазарук, М. А. Уводзіны ў літаратуразнаўства / М. А. Лазарук, А. Я. Ленсу. — 2-е выд. — Мінск, 1982.

4. Лаўшук, С. С. На драматургічных скрыжаваннях / С. С. Лаўшук. — Мінск, 1989.

5. Хализев, В. Е. Драма как род литературы: поэтика, генезис, функционирование / В. Е. Хализев. — М., 1986.

6. Шаўлоўская, М. Беларуская драматургія / М. Шаўлоўская. — Мінск, 1981.

7. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. — Мінск, 1984—1987.

## ЗМЕСТ

**Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў . . . 3**
Тлумачальная запіска . . . 3
Прагназуемыя вынікі . . . 8
**Літаратура . . . 10**

**Дапаможнік для настаўнікаў . . . 12**
Уводзіны . . . 12
Прыкладнае планаванне факультатыва «Незвычайнае літаратуразнаўства: вывучэнне твора ў яго родавай і жанравай спецыфіцы» . . . 16
Хто такі пісьменнік? . . . 18
Творчая сустрэча-дыялог з пісьменнікам-земляком (ці прадстаўленне настаўнікам аднаго з сучасных дзіцячых пісьменнікаў) . . . 25
Што такое твор? . . . 25
Агульнае ўяўленне пра роды літаратуры . . . 26
Лірыка і лірычныя жанры . . . 29
«Цвёрдыя» формы верша . . . 43
Эпічныя жанры . . . 49
Ліра-эпічныя жанры . . . 53
Драматычныя жанры . . . 56
Запрашэнне ў тэатр . . . 57
Роздум перад спектаклем . . . 58
Спектакль . . . 59

В у ч э б н а е   в ы д а н н е

Беларуская літаратура
Факультатыўныя заняткі

**РУСІЛКА** Вольга Іванаўна

**НЕЗВЫЧАЙНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА: ВЫВУЧЭННЕ ТВОРА Ў ЯГО РОДАВАЙ І ЖАНРАВАЙ СПЕЦЫФІЦЫ**

**8 клас**

***Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання***

Рэдактар *К. С. Голуб*
Камп’ютарная вёрстка *А. М. Макаранка*
Мастацкі рэдактар *В. П. Калінін*
Стыльрэдактар *К. С. Голуб*

Падпісана ў друк 20.10.2010. Фармат 60×84$^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура Times New Roman. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 3,72. Ул.-выд. арк. 3,88. Тыраж 3400 экз. Заказ .

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва».
ЛИ 02330/0494044 ад 03.02.2009.
Вул. Захарава, 19, 220034, г. Мінск.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Друкарня “Перамога”».
ЛП 02330/0494182 ад 03.04.2009.
Вул. Таўлая, 11, 222310, г. Маладзечна, Рэспубліка Беларусь.

# ДЛЯ ЗАМЕТАК